

ПРА ДУБЛЁНКУ, ВАЛЁНКІ І ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

5

КРАІНА ПАСПЯХОВАГА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА МС




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 СНЕЖНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 237 (29104)


9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей ПАДВОЙСКІ, начальнік аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства аб непаўналетніх і моладзі Генпракуратуры:**

*«Усё часцей падлеткі здзяйсняюць злачынствы і правапарушэнні з выкарыстаннем інтэрнэт-асяроддзя. І расце, вядома ж, колькасць дзяцей, якія становяцца ахвярамі кіберзлачынстваў. Напрыклад, колькасць дзяцей, якія пацярпелі ад злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і ад крадзяжоў з дапамогай камп'ютарнай тэхнікі, узрасла больш чым у два разы за апошні год. Нярэдка ў сеціве дзеці адчуваюць на сабе прыніжэнне, абразу, здзекі — так званы кібербулінг. Яны сутыкаюцца з інфармацыяй, якая змяшчае гвалт, прапаганду самагубства і псіхаактыўных рэчываў, нетрадыцыйных сексуальных зносін».*

# Падарунак да месца





Фота БелТА.

**У гомельскім мікраараёне Шведская Горка навагодні настрой мясцовым жыхарам будзе дарыць асаблівая ёлка: зялёную прыгажуню прывезлі не з лесу, а з дачнага падворка ў пасёлку Чырвоная Слабада Рэчыцкага раёна. Яшчэ ў сярэдзіне лістапада на электронную пошту Гомельскага аблвыканкама жыхар мікраараёна Шведская Горка даслаў зварот з просьбай не пакінуць гэтую тэрыторыю, дзе пражываюць каля 13 тысяч чалавек, без святочнага настрою і абавязковага сімвала Новага года — упрыгожанай ёлкі. У гэты ж час на пошту прыйшло яшчэ адно паведамленне: «Падару Гомелю (раёну) да Новага года хатнюю ёлку», — напісаў дачнік Уладзімір ЛАГВІНЕНКА *(на фота)*. Дзве ініцыятывы вырашылі аб'яднаць. У дачны пасёлак дэлегавалі брыгаду з сямі чалавек, адправілі аўтавышку, аўтакран для пагрузкі, трал для перавозкі. Вялікае прыгожае дрэва было паспяхова дастаўлена і ўстаноўлена на месцы прызначэння.**

## КОРАТКА

- **У Беларусі прапануецца павялічыць базавую велічыню да Br27.**
- Двухбаковыя перагаворы ЕС і Беларусі аб далучэнні да СГА ў частцы гандлю ўступілі ў фінальную стадыю.
- **Затрыманыя падазраваныя па справе аб забойстве журналіста Паўла Шарамета, якое адбылося 20 ліпеня 2016 года ў Кіеве.**
- Прыватную школу плануюць пабудаваць у Магілёве.
- **Мінтранс прапанаваў Нарвегіі адкрыць прамыя авіярэйсы ў Беларусь.**

Без дурману

# АД СПАЙСАЎ ДА СНЮСАЎ

## Пра наркотыкі з дзецьмі трэба гаварыць раней, чым яны паспрабуюць атруту

**Калі Максіму было дзесяць, яго мама і тата разводзіліся — хлопчык пачаў ужываць наркотыкі. Бацькі звярнуліся да нарколагаў, калі сыну ўжо споўнілася 14, ды і то толькі калі з хаты зніклі залатыя рэчы і грошы...**
**Вікторыі, маці 11-класніка Мішы, пазваніла мама яго сябра з пытаннем «Ці не сябруе твой з Сашам? Бо ён, аказваецца, наркаман». Яна павярнулася да сына і спытала «Ты выпадкова не ўжываеш?» — на гэта хлопец заявіў: «Ты што, звар'яцела? Канешне, не». Аднак на просьбу здаць аналізы адмовіўся. Пасля настойлівых роспытаў прызнаўся, што раз такі паспрабаваў.**
**Калі маці з сынам прыйшлі да нарколага, высветлілася, што Міша прымае наркотыкі з 8 класа і мае поўны сіндром залежнасці... У яшчэ адной сям'і бацькі, якія разводзіліся, наадварот, сышліся ізноў, пакуль ратавалі дзіця ад наркаманіі.**

СТАР. 4

Ведай нашых!

# Мурал з Мінска прызналі найлепшым у свеце



Фота instagram-акаўнт мастака.

**Работу беларускага мастака Яўгена Сасюры «Лічбавы свет», якая з'яўляецца часткай манументальнага арт-трыпціха «Будучыня» ў сталічным мікраараёне Каменная Горка, назвалі найлепшай у свеце. Галасаванне праходзіла на міжнароднай платформе Street Art Cities, каманда якой папярэдне выбрала 16 найбольш заўважных манументальных роспісаў, што былі зроблены сёлета ў розных краінах.**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2020 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

## НА ФУНДАМЕНЦЕ ГІСТОРЫІ

### Аляксандра Лукашэнку запрасілі наведаць В'етнам з афіцыйным візітам

**Запрашэнне генеральнага сакратара Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі В'етнама Нгуена Фу Чонга падчас сустрэчы ў Палацы Незалежнасці перадала старшыня парламента (Нацыянальнага сходу) Нгуен Тхі Кім Нган.**

Паміж дзяржавамі склалася традыцыя абмену афіцыйнымі візітамі на ўсіх узроўнях. Прэзідэнт Беларусі наведваў гэту краіну Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна ўжо тройчы — у 1997, 2008 і 2015 гадах. Кіраўнікоў В'етнама таксама тройчы віталі ў Мінску з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Апошні раз — у 2017 годзе.

Тое, што спікеры парламента В'етнама частыя госці Беларусі, адзначыў наш Прэзідэнт: «Вашы старшыні ў нас у Беларусі пастаянныя госці. У нас вельмі добрыя сувязі. Яны заснаваны на гісторыі нашых краін, добрай гісторыі, якая можа быць гонарам любых дзяржаў і базай для развіцця адносін».

На гістарычны фундамент паспяхова кладуцца каменьчыкі мура адносін не толькі ў выглядзе афіцыйных візітаў, але і эканамічнага, палітычнага супрацоўніцтва. У 2018 годзе тавараабарот паміж краінамі склаў 115 мільёнаў долараў ЗША, а сёлета толькі па звестках за студзень — верасень лічба перавысіла 153 мільёны.

«За апошнія часы мы шмат зрабілі, каб гандлёва-эканамічныя нашы адносіны развіваліся больш паспяхова. Што датычыцца палітыкі, міжнароднага парадку дня, то ў нас (В'етнама і Беларусі) досыць добрыя пазіцыі. І па парадку дня міжнародных адносін яны абсалютна падобныя», — паведаміў кіраўнік краіны і выказаў спадзяванне, што візіт Нгуен Тхі Кім Нган надасць новы імпульс усім кірункам узаемадзеяння.

Старшыня Нацыянальнага сходу В'етнама ў гэтай якасці першы раз у Беларусі, але яна ўжо наведвала Мінск, суправаджаючы кіраўніка сваёй дзяржавы. Нгуен Тхі Кім Нган выказала ўдзячнасць Аляксандру Лукашэнку за магчымасць сустрэчы.

**Марыя ДАДАЛКА.**

* * *

У той жа дзень з в'етнамскай дэлегацыяй на чале са старшынёй Нацыянальнага сходу Нгуен Тхі Кім Нган сустрэліся спікеры абедзвюх палат беларускага парламента. І гэта была першая міжнародная сустрэча для беларускіх дэпутатаў і сенатараў сёмага склікання.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава заявіла, што Беларусь разглядае В'етнам у якасці стратэгічнага партнёра ў рэгіёне Паўднёва-Усходняй Азіі. «Аднак узровень узаемнага тавараабароту паміж краінамі не адпавядае існуючаму патэнцыялу. Неабходна развіваць узаемны гандаль і даводзіць эканамічнае супрацоўніцтва да ўзроўню палітычнага», — сказала Наталля Качанава.

Яна прапанавала інтэнсіфікаваць міжпарламенцкія адносіны, зрабіць сустрэчы парламентарыяў рэгулярнымі.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка таксама лічыць, што Беларусі і В'етнаму прынцыпова важна надаць дадатковы імпульс сваяму дыялогу. Ён паведаміў, што не пазней за студзень у парламенце Беларусі будзе створана група дружбы з в'етнамскімі калегамі. Паводле яго слоў, бакі зацікаўлены больш увагі аддаваць гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву, у тым ліку на рынках АСЕАН і ЕАЭС, узаемадзеянню на міжпарламенцкіх пляцоўках.

Нгуен Тхі Кім Нган падзякавала беларускаму боку за цёплы прыём. Яна адзначыла, што мэта яе візіту — развіццё і паглыбленне традыцыйнай дружбы, шматпланавага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і В'етнамам, у тым ліку на ўзроўні парламентаў.

# ПАМНОЖЫЦЬ НА ДВА «І» — ІНВЕСТЫЦЫІ І ІНАВАЦЫІ

### Беларусі і Татарстану трэба шукаць новыя пункты росту тавараабароту

**Узаемны тавараабарот Беларусі з самым значным партнёрам у Прыволжскай федэральнай акрузе Расіі па выніках 2018 года наблізіўся да аднаго мільярда трохсот мільёнаў долараў (агульная лічба з усёй Расіяй летась склала больш за 35 мільярдаў). Такую значную суму ў гандлі з гэтай рэспублікай Расіі ствараюць сумесныя праекты ў нафтагазавай сферы і машынабудаванні.**
**Як зберагчы вопыт і павялічыць патэнцыял супрацоўніцтва, у Мінску абмяркоўвалі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Рэспублікі Татарстан Рустам Мініханаў.**



Фота БелТА.

«Каб захаваць і прымножыць гэты годны вынік, нам трэба шукаць новыя пункты росту. Галоўным вектарам узаемадзеяння ў гэтым кірунку бачыцца павелічэнне аб'ёмаў інавацыйнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва. Ведаю, што вы робіце ў сваёй рабоце асноўны акцэнт на ўкараненне ў практыку перадавых тэхналогій і навуковых дасягненняў. Мы прытрымліваемся тых жа крытэрыяў», — заўважыў на перагаворах кіраўнік Беларусі.

На гэтых прынцыпах развіваецца кааперацыйны праект «МАЗа», МТЗ, «Амкадора», «БелАЗа» з татарстанскім холдынгам «РарыТЭК» па стварэнні газаматорнай тэхнікі. За апошнія два гады сабрана амаль 200 аўтобусаў, якія працуюць на газе. У 2020 годзе будзе выраблена яшчэ столькі ж адзінак падобнай тэхнікі.

Але гэта не ўсе высокатэхналагічныя перспектыўныя праекты Беларусі з Татарстанам. Сумесна з Мінскім маторным заводам прасоўваецца работа па вытворчасці чатырох- і шасціцыліндравых газавых рухавікоў для трактароў МТЗ і машын «Амкадор». У перспектыве плануецца пераход на гэты від паліва самазвалаў «БелАЗ».

«Гэтыя прыклады пацвярджаюць, што мы абралі шлях не канкурэнцыі, а партнёрства. Развіваецца самадастатковае ўзаемадзеянне — ствараюцца новыя рабочыя месцы, даюцца роўныя магчымасці для прадпрыемстваў Беларусі і Татарстана. Распаўсюджванне гэтага паказальнага вопыту на іншыя рэгіёны Расіі забяспечыла б большую аддачу ад эканамічнага дыялогу», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

На перагаворах бакі вызначылі задачу на будучыню — дасягнуць гадавога ўзроўню тавараабароту ў два мільярды долараў. Паспрыяць росту двухбаковага гандлю можа паглыбленне кааперацыі ў машынабудаванні і рэалізацыя новых праектаў у галіне інавацый.

Падзякаваў Прэзідэнт Беларусі і за разумнае, партнёрскае стаўленне да «МАЗа», нягледзячы на існаванне завода «КамАЗ»: «Вы не лабіруеце «КамАЗ», бачыце, што дзесьці «МАЗ» лепш падыходзіць ім. Я дзесьці, можа, «КамАЗ» не выпускае такую прадукцыю».

Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што краіна мае сур'ёзныя магчымасці ў галіне нана- і біятэхналогій, а беларускі Парк высокіх тэхналогій з'яўляецца адным з найбуйнейшых кластараў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе па распрацоўцы камп'ютарных прадуктаў.

«Мы гатовы наладзіць цеснае ўзаемадзеянне ў гэтай сферы з казанскім IT-паркам і іншымі навукова-вытворчымі цэнтрамі Татарстана», — запэўніў лідар Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з Прэзідэнтам Татарстана пытанні па нафтахімічным сектары, які з'яўляецца ключавым кірункам супрацоўніцтва Беларусі і гэтага рэгіёна Расіі. На долю нафтахіміі прыпадае палова тавараабароту. «Мы якраз вядзём з Расіяй дыялог па выбудоўванні супрацоўніцтва ў галіне нафты. Я думаю, што сённяшняя размова (а мы аб гэтым пагаворым) будзе вельмі важная не толькі ў інфармацыйным плане, але і ў сувязі з работай у гэтым сектары», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Перспектывамі для больш шырокага ўзаемадзеяння валодае і сфера экалагічнай бяспекі. У 2019 годзе Расія ўключыла ў парадак дня актуальнае ва ўсім свеце пытанне перапрацоўкі адходаў і другасная сыравіны. «У гэтай сферы мы гатовы з вамі супрацоўнічаць аж да будаўніцтва смеццеперапрацоўчых заводаў «пад ключ», калі вас гэта зацікавіць. У нас аналагічнае прадпрыемства функцыянуе ў Брэсце. Вы ці вашы спецыялісты могуць яго паглядзець», — прапанаваў беларускі лідар.

У Беларусі і Татарстана ёсць вялікія магчымасці і перспектывы для прасоўвання сумесных рэгіянальных праектаў, кантактаў медыцынскіх і адукацыйных устаноў, маладзёжных арганізацый. Прэзідэнт падзякаваў татарскім гасцям за стварэнне камфортных умоў для беларускай каманды ў Казані, дзе праходзіў чэмпіянат свету па прафесійным майстэрстве «WorldSkills-2019». Дзякуючы ў тым ліку і цёпламу прыёму гаспадароў беларусы паказалі добрыя вынікі ў катэгорыях «Тэхналогіі праектавання ў будаўніцтве» і «Прамысловы дызайн».

* * *

Падчас візіту ў Беларусь Прэзідэнт Татарстана правёў сустрэчу ў мінскай мячэці з актывам татарскай суполкі, наведаў прадпрыемства «БелАЗ», дзе сам змог пратэсціраваць самазвал за рулём. Пасля сустрэчы ў Палацы Незалежнасці Прэзідэнт Татарстана правёў перагаворы па нафтахіміі з прэм'ер-міністрам Беларусі Сяргеем Румасам.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ЗША абралі самыя моцныя флаты

Амерыканскі часопіс The National Interest пералічыў краіны з самымі магутнымі флатамі. Першае месца, на думку аўтараў, заняў амерыканскі флот. Адзначаецца, што ён мае найбольшую колькасць караблёў і самую вялікую зону адказнасці. Флот ЗША налічвае 288 караблёў, сярод якіх 10 авіяносцаў, 62 эсмінцы і 17 фрэгатаў.

На другое месца спіса журналісты паставілі ваенна-марскі флот Кітая, які мае 25 эсмінцаў, 42 фрэгаты, тры дэсантныя караблі і іншыя. Расія, на думку The National Interest, з'яўляецца трэцяй у свеце па магутнасці флоту. Расійскія ВМС атрымалі ў спадчыну асноўную частку савецкіх караблёў, але на ўзбраенне рэгулярна паступаюць і новыя. Паводле падлікаў журналістаў, у расійскім флоце налічваецца 79 буйных караблёў, у тым ліку 13 эсмінцаў, адзін авіяносец, пяць крэйсераў і 52 падводныя лодкі. Амаль усе яны пабудаваны ў перыяд халоднай вайны.

На чацвёртым месцы размясціўся Каралеўскі ВМФ Вялікабрытаніі, які налічвае 19 фрэгатаў і эсмінцаў, тры вялікія караблі, сем ударных атамных падводных лодак і чатыры падлодкі з балістычнымі ракетамі. Замыкае пяцёрку японскі флот — 114 караблёў. Падводны флот гэтай краіны, які мае ў сваім складзе 16 караблёў, з'яўляецца адным з найлепшых у свеце.

### Facebook і Google страцілі пазіцыі на рынку працы

Амерыканскія высокатэхналагічныя карпарацыі Facebook і Google выбылі з топ-10 найлепшых работадаўцаў Амерыкі, паведамляе Bloomberg са спасылкай на штогадовае даследаванне партала Glassdoor.

За апошнія дзесяць гадоў сацыяльная сетка Facebook тройчы займала першы радок рэйтынга найлепшых работадаўцаў, але сёлета яна заняла толькі 23-е месца. Яшчэ год таму кампанія Марка Цукерберга была сёмай у спісе, а за год да гэтага — безумоўным лідарам. Facebook імкліва страчвае сваю папулярнасць з-за шматлікіх скандалаў з прыватнасцю, што паўплывалі не толькі на карыстальнікаў, якія больш не давяраюць Facebook, але і на саміх супрацоўнікаў кампаніі, чый дух і матывацыя знізіліся з-за вялікай колькасці негатыўных публікацый пра карпарацыю. Таксама саіскальнікі масава адмаўляюцца ад прапанаваных ім вакансій у кампаніі, якая раней лічылася адным з найлепшых работадаўцаў Амерыкі.

Дзясятку найлепшых рэйтынга Glassdoor пакінуў і Google, які нязменна ўваходзіў у топ-10 на працягу апошніх васьмі гадоў, а ў 2015 годзе заняў першае месца. Цяпер Google знаходзіцца ўсяго толькі на 11-м месцы. Рэпутацыя Google, як і Facebook, сур'ёзна пацярпела за апошнія пару гадоў — супрацоўнікі кампаніі баставалі супраць шматлікіх выпадкаў сексуальных дамаганняў на рабочым месцы, ваенных кантрактаў з Пентагонам і незаконных звальненняў незадаволеных работнікаў.

### «Партрэт жанчыны» Клімта коштам у 66 мільёнаў знайшлі праз 22 гады



Карціну «Партрэт жанчыны» пэндзля аўстрыйскага мастака Густава Клімта знайшлі ў тайніку ў музеі, з якога яна была выкрадзена 22 гады таму, піша The Guardian. Палатно стала адным з самых адшукваемых прадметаў мастацтва пасля таго, як у 1997 годзе знікла са сцяны ў галерэі сучаснага мастацтва ў італьянскім горадзе П'ячэнца. Яго кошт ацэньваецца ў 66 мільёнаў долараў. Лічыцца, што скрадзеная карціна ўвесь гэты час заставалася ў галерэі. Яе знайшоў садоўнік, які счышчаў са знешняй сцяны будынка плюшч. За раслінай ён выявіў патаемныя жалезныя дзверы, за якімі знаходзіўся тайнік. Работа Клімта ляжала ў мяшку. Паводле звестак выдання, эксперты ўжо высветлілі, што карціна належыць менавіта пэндзлю Клімта, які напісаў яе ў 1917 годзе. Афіцыйнай заявы кіраўніцтва галерэі яшчэ не зрабіла.

Перадсвяточнае

# Больш за мільён салодкіх падарункаў

## вагой ад 300 грамаў да трох кіло плануе падрыхтаваць сёлета фабрыка «Камунарка»

**За год цукерачны гігант стварае 30 тысяч тон прадукцыі: цукерак, шакаладак, вафельных торцікаў і эксклюзіўных «салодкіх карцін», распісаных уручную.**

Зберагаючы традыцыі, «Камунарка» паралельна абнаўляе свае лініі, каб дасягнуць большага імпартазамяшчэння. Серыя шакаладу «Дзіцячыя гісторыі», па словах **генеральнага дырэктара прадпрыемства Івана ДАНЧАНКІ**, гэта «поўны аналаг малочнага шакаладу Kinder, толькі без пальмавага алею». У найбліжэйшай будучыні прадпрыемства плануе інвеставаць грошы ў карамельныя вырабы і стварыць малочны шакалад для дзяцей з серыі «Прэзідэнт».



Перад навагоднімі святамі больш як паўтаратысячны калектыў фабрыкі павялічваецца на 150 чалавек, якіх наймаюць спецыяльна для фасоўкі падарункаў.

— Гэта ў асноўным бабулі, якія з пяшчотай і нават з песнямі працуюць на лініі і думаюць, як робяць салодкія падарункі для сваіх унукаў. Кожны пяты з нашых супрацоўнікаў, хто не працуе непасрэдна ў цэху, таксама штодня выходзіць на фасоўку. З дрэнным настроем увогуле з цукеркамі працаваць нельга, бо горкія атрымаюцца, — упэўнены кіраўнік «Камунаркі».

А ўжо ў лютым на фабрыцы пачнуць рыхтавацца да 2021 года, прыдумваць новыя смакі, формы і колеры салодкіх шэдэўраў.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**





# НАВАГОДНІ ЭКСПРЭС ДА ДЗЕДА МАРОЗА

**Турыстычны праект «Падарожжа ў маёнтак Дзеда Мароза» існуе ўжо на працягу васьмі гадоў і карыстаецца вялікай папулярнасцю як у беларусаў, так і ў гасцей нашай краіны. Спецыяльны маршрут выхаднога дня раслічаны на турыстаў у навагодніх і калядныя святы, а таксама на перыяд зімовых канікул — на школьнікаў. Навагодні цягнік, які складаецца з купэйных вагонаў, будзе курсіраваць з Мінска ў маёнтак Дзеда Мароза ў Нацыянальным парку «Белавежская пушча» 13, 20, 24, і 27 снежня, а таксама 2, 4, 6 і 11 студзеня.**

Паездкі прапануюцца ў фармаце тураў выхаднога дня з выездам у пятніцу ўвечары, а рэйсы Навагодняга экспрэса 24 снежня, 2, 4, 6 і 11 студзеня разлічаны на перыяд зімовых канікул у школьнікаў.

Навагодні састаў будзе адпраўляцца ў маёнтак Дзеда Мароза са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 21.57 і прыбываць у Брэст раніцай наступнага дня ў 7.50, адкуль турыстаў даставяць у Белавежскую пушчу на камфартабельных аўтобусах.

Святочную атмасферу пасажыры адчуюць з першых хвілін — каля вагонаў іх сустрэнуць дзяўчаты-правадніцы ў касцюмах Снягурак.

У Нацыянальным парку госці правядуць цэлы дзень. Падарожнікаў чакае насычаная навагодняя экскурсійная праграма: яны ўбачаць домік Снягуркі, чароўны млын, наведаюць музей падарункаў Дзеда Мароза — «Скарбніцу», пабываюць на алеі знакаў усходняга календара і паляне дванаццаці месяцаў, станцуць у карагод каля навагодняй ёлкі і, вядома, сустрэнуцца з гаспадаром рэзідэнцыі — Дзедам Марозам.

У праграму туру таксама ўваходзіць знаёмства з музеем прыроды Нацыянальнага парку «Белавежская пушча», шпацыр уздоўж вальераў з жывёламі і пачастунак блінамі з гарбатай на пушчанскіх травах.

Назад у сталіцу з Брэста Навагодні цягнік накіруецца ў 17.28 і прыбудзе ў Мінск у 22.18. Яркім момантам падарожжа стане забаўляльная праграма з аніматарамі і сустрэча з чарунічным Дзедам Марозам. Юныя вандроўнікі раскажуць Дзеду Марозу вершы, праспяваюць з ім песенькі, пацешаць сваімі малюнкамі — уражаннямі пра паездку, разгадаюць загадкі і, натуральна, атрымаюць салодкія пачастункі.

Як зазначылі ў прэс-цэнтры БЧ, штогод турыстычным цягнікам па маршруце Мінск — Брэст — Мінск перавозіцца больш за 1,6 тысячы чалавек. Плануецца, што ў гэтым сезоне «Падарожжа ў маёнтак Дзеда Мароза» зробяць больш за дзве тысячы пасажыраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Прыгожае жыццё

# Good Luck, Насця!

## У Лондане фінішуе конкурс «Міс Свету»

**Заўтра ў сталіцы Вялікабрытаніі пройдзе фінал найстарэйшага і, бадай, самага маштабнага ў сферы прыгажосці конкурсу «Міс Свету» — 112 прэтэндэнтак на адну карону.**

Прадстаўніца нашай краіны Анастасія Лаўрынчук («Міс фота» на нацыянальным конкурсе прыгажосці 2018-га) знаходзіцца ў Лондане з 20 лістапада і актыўна ўдзельнічае ва ўсіх прамежкавых этапах, за якія налічваюцца дадатковыя балы ў барацьбе за галоўны тытул. Напрыклад, беларуска ўвайшла ў топ самых спартыўных удзельніц. А выпрабаванні ў намінацыі «Спорт», між іншым, былі сур'ёзныя, не дзеля птушачкі: чаўночны бег, 60-метровы спрынт, скачкі ў даўжыню, а таксама эстафета, дзе, па трапным выразе арганізатараў спаборніцтва, некаторыя канкурсанткі паказалі вынік, якім мог бы ганарыцца нават знакаміты бягун Усейн Болт.

Таксама Анастасія Лаўрынчук стала прызёркай у групавым этапе шматступеньчатага інтэлектуальнага турніру «Head to Head», які правярае эрудыцыю, кемлівасць і знаходлівасць удзельніц, актыўную жыццёвую пазіцыю і ўменне яе абгрунтаваць. Беларуска падчас інтэрв'ю расказала пра сваю дабрачынную дзейнасць — падтрымку сем'яў-усынавіцеляў у вырашэнні шэрагу праблем, з якімі прыёмныя бацькі і дзеці сутыкаюцца штодня. Па выніках гэтага конкурсу дзяўчына ўвайшла ў лік 19 самых інтэлектуальных прыгажунь свету і зноў-такі атрымала дадатковыя бонусныя балы.

Падтрымаць нашу зямлячку і даць ёй балаў у барацьбе можна і ў інтэрнэт-галасаванні за «Міс глядацкіх сімпатый», якое праходзіць на афіцыйным сайце конкурсу missworld.com. На гэты момант у ім лідзіруюць дзяўчаты з Украіны, В'етнама, Непала і Бангладэш, у якіх больш чым 10 % галасоў за кожную.



Фота Instagram канкурсанткі.

Фінал 69-га міжнароднага конкурсу «Міс Свету», нагадаем, адбудзецца 14 снежня ў выставачным цэнтры ExCeL London. У Беларусі тэлеверсію вялізнага шоу ў гэты ж дзень пакажа тэлеканал АНТ.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Блізкая ўлада**

## АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І СВОЕЧАСОВЫЯ АДКАЗЫ

**Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца ў гэтую суботу, 14 снежня. На званкі ў рэгіёнах краіны з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:**

старшыня БРЭСЦКАГА аблвыканкама Анатоль Васілевіч ЛІС. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Генадзь Міхайлавіч САЛАВЕЙ. Тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

старшыня МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Леанід Канстанцінавіч ЗАЯЦ. Тэл. 8 022 250 18 69;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# ВОСЬ І ЯНА — ЕЎРА-ЗІМА

## Тэмпература паветра ўдзень будзе дасягаць 7 цяпла

**Зразумелая зіма з маразамі не спяшаецца ў нашу краіну. У Беларусі ў найбліжэйшыя дні захаваецца перадзімовы характар надвор'я, ападкі будуць выпадаць у выглядзе дажджу і мокрага снегу, а тэмпературны фон па-ранейшаму будзе вышэй за кліматычную норму і адпавядаць лістападаўскім значэнням, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу франтальныя раздзелы прынясуць уначы месцамі, а ўдзень на большую частку тэрыторыі краіны кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, які ўначы будзе суправаджацца парывістым ветрам. Чакаюцца слабы туман, уначы і раніцай слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. У начны час будзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла, удзень ад нуля да плюс 5 градусаў, а па паўднёвым захадзе краіны — да 7 цяпла.

У нядзелю на тэрыторыі краіны ўсталюецца класічная еўра-зіма. Бо ў гэты дзень да нас зацягне актыўныя франтальныя раздзелы, якія ссоўваюцца з боку Заходняй Еўропы. На большай частцы рэгіёна чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай — слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад 2 градусаў з мінусам да 4 цяпла, удзень — плюс 1—7 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак уначы захаваецца ўплыў атмасфернага фронту, а ўдзень надвор'е абумовіць вобласць паніжанага атмасфернага ціску. Таму ноччу на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаюцца туман, уначы і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла, а ўдзень — ад плюс 1 градуса да 7 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# БЕРАЖЫЦЕ КОДЫ І ПАРОЛІ

**Беларусбанк папярэджвае, што махляры зноў актывізаваліся. Таму ён настойліва просіць усіх сваіх кліентаў не перадаваць трэцім асобам інфармацыю аб рэквізітах плацежных картак. Пад трэцімі асобамі варта разумець сваякоў, сяброў, знаёмых і, у тым ліку, супрацоўнікаў банкаў.**

Нікому не трэба паказваць, у тым ліку шляхам уводу даных на сумніўных вэб-старонках, нумар і тэрмін дзеяння карткі, CVV/CVC-код, пін-код, паролі 3D-Secure, ідэнтыфікацыйны нумар дакумента, які сведчыць асобу, даныя для ўваходу ў сістэму «Інтэрнэт-банкінг» (лагін, пароль, картукодаў) і СМС-коды, што накіроўваюцца ад імя банка. Уваход у сістэму «Інтэрнэт-банкінг» ажыццяўляйце з афіцыйнага сайта банка, не пераходзьце па падазроных спасылках.

У выпадку, калі з нейкіх прычын гэтыя звесткі былі перададзеныя зламыснікам ці інакш скампраметаваныя:

— неадкладна заблакуйце ўліковы запіс сістэмы «Інтэрнэт-банкінг» шляхам трохразовага няправільнага ўводу пароля альбо па тэлефоне кантакт-цэнтра 147. У іншым выпадку можна заблакаваць картку па тэлефоне круглаcутачнай службы сэрвісу кліентаў ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр» (017) 299 25 26. Таксама можна звярнуцца ў найбліжэйшае аддзяленне банка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Ведай нашых!

# МАГІЛЁЎСКІЯ КУЛІНАРЫ АТРЫМАЛІ МЕДАЛІ І КУБКІ

Студэнты Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання прадэманстравалі ў Польшчы высокія прафесійныя здольнасці

**Гэта адбылося на Усепольскім кулінарным конкурсе «Польская кулінарыя Мазовіі», які быў прысвечаны аўтэнтычнай кухні гэтай краіны. Цікава, што ў камандным заліку самі гаспадары нават не трапілі ў тройку пераможцаў. Затое беларусы адзначыліся там двойчы.**

— Спаборніцтва вялося па двух кірунках — кулінарнае мастацтва і рэстаранны сэрвіс. У першым перамаглі немцы, другія былі мы, а трэція палякі, у другім — першыя два месцы занялі палякі, а трэцяе мы. Але пераможцы вызначаліся па камандным заліку. У выніку на п'едэстал падняліся толькі немцы і мы. Нашы студэнты занялі другое і трэцяе месцы, — удакладніла **прарэктар па выхаваўчай рабоце Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання, нацыянальны эксперт WorldSkills Belarus па кампетэнцыі «Кулінарнае мастацтва» Вольга МАЦЫКАВА.**

«Серабро» за кулінарнае мастацтва атрымалі студэнты другога курса Кірыл Кажуленка і Аляксандр Аўрамчык, а трэцякурснік Мікіта Шэлегаў адзначаны бронзавай узнагародай як афіцыянт у рэстаранным сэрвісе. Дарэчы, адным з важных патрабаванняў было веданне гэтай справы на англійскай мове, і Мікіта са сваёй задачай выдатна справіўся. Барацьба была вельмі напружаная, у фінале за правы быць першымі змагалася 12 камандаў.

У Польшчы беларусы таксама не ўпусцілі магчымасці ацаніць кулінарны бізнес гэтай краіны і наведалі рэстаран аўтарскай кухні Epoka, пазнаёміліся з яго шэф-поварам і пабывалі на кухні.


Фота з сайта Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання.

Вольга Мацыкава паведаміла, што магілёўская ВНУ, якая рыхтуе спецыялістаў у галіне харчовай прамысловасці, шмат працуе на прэстыж кулінарнай прафесіі. Дастаткова згадаць кухара Мікіту Цвяткова, які стаў першым пераможцам беларускага этапу WorldSkills у сваёй кампетэнцыі і першы з беларусаў перамог на гэтых жа спаборніцтвах у Расіі. Цяпер універсітэт рыхтуе ўдзельнікаў да чарговага чэмпіянату WorldSkills Беларусь. Дарэчы, сваю альма-матар там будзе прадстаўляць і прызёр кулінарнага конкурсу ў Польшчы Кірыл Кажуленка.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# Мурал з Мінска прызналі найлепшым у свеце

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пераможцам апытання, паведамілі актывісты арт-праекта Urban Myths, стаў выкананы ў тэхніцы фотарэалізму мурал на дзевяціпавярховіку па вуліцы Прытыцкага, 134. Яго аўтар — ураджэнец Пінска Яўген Сасюра. Мастак працуе пад творчым псеўданімам Mutus і ўжо добра вядомы на радзіме як аўтар першага легальнага роспісу ў родным горадзе (2012 год), муралаў-паштовак з ландшафтамі старога Пінска (2016 год), роспісаў у межах міжнароднага фестывалю Vulica Brasil і камерцыйных работ па замове розных устаноў і гарадскіх уладаў. Яўген ужо расказваў, што работа «Лічбавы свет» прысвечана сувязі свету глабальных камунікацый і традыцыйнага ладу жыцця прыроды: «У вобразе галоўнай гераіні спалучыліся сучасная дзяўчына, жыхарка Мінска, і персанаж славянскай міфалогіі, багіня Мокаш, якая апекавалася ткацтвам і іншымі жаночымі рамёствамі, а таксама чалавечымі лёсамі наогул». Дзве другія часткі трыпціха «Будучыня», якія сімвалізуе рух Беларусі з сёння ў заўтра, — мурал «Фрыланс» сербскага мастака Artez і твор каталонца Slim «Героі новага часу» — размешчаныя на суседніх шматпавярховіках.

Да міжнароднага поспеху Яўген Сасюра ставіцца вельмі спакойна: «Я не ўспрымаў бы гэта як нейкую надзвычай сур'ёзную падзею, проста падпісчыкі аднаго з мастацкіх аб'яднанняў прагаласавалі за ўпадабаную работу. Ці будуць новыя муралы? Безумоўна, але ўжо ў наступным сезоне — зараз назапашваю і прадумваю новыя ідэі, якіх заўжды хапае». Зрэшты, тут можна запярэчыць сціпласці беларускага мастака: міжнародная суполка Street Art Cities, якая ўхваліла яго работу, існуе з 2017 года, дзейнічае ў 570 гарадах 79 краін свету і ўтрымлівае інфармацыю пра мастацкія работы больш чым 24 300 аўтараў! У прыватнасці, у Беларусі «паляўнічыя на вулічныя роспісы» налічылі ўжо звыш 600 цікавых і вартых увагі стрыт-арт-аб'ектаў, прадстаўленых на інтэрактыўнай карце.

Як адзначае каманда праекта Street Art Cities, перамога беларуса стала «крыху нечаканай» — ён набраў 53 % галасоў ад больш чым тысячы прыхільнікаў стрыт-арту з розных краін і абышоў сусветна вядомых вулічных мастакоў INTI з Чылі, Lula Goce з Іспаніі і Sasha Korban з Украіны.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# АД СПАЙСАЎ ДА СНЮСАЎ

## ПАСПРАБАВАЦЬ МОЖА КОЖНЫ

Такіх прыкладаў процьма, але яднае іх адно — наркатычная бяда, заўважыць, а тым больш прызнаць якую духу хапае не ва ўсіх. Працей праматаць, заплюшчыць вочы, адмахнуцца... пакуль не стане позна.

— Гэта страшнае захворванне з распадам асобы, маральнымі, этычнымі, фізічнымі і псіхалагічнымі парушэннямі. Паспрабаваць можа кожны. Асабліва ў падлеткавым узросце. Адзін пакаштаваў — не спадабалася, а іншаму прыйшлося даспадобы. І тут толькі ў тэрміне адрознение, калі када зацягне ў залежнасць, — кажа **Людміла ШПАКОЎСКАЯ, загадчык падлеткавага аддзялення Гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера.** — Нават калі дзіця ведае, што гэта кепска, яно можа паспрабаваць. Вось хлопец пасварыўся з маці, выйшаў з хаты, грукнуўшы дзвярыма. А ў пераходзе яму прапанавалі псіхатроп, і ён узяў. І ён не будзе лічыць, што зрабіў нешта катастрафічна непапраўнае і няправільнае.

Часта бацькі баяцца, што іх дзіця паставяць на ўлік і гэта ляжа нязмыўнай плямай на ўсё яго жыццё, таму не звяртаюцца да спецыялістаў, нават калі бачаць праблему і разумеюць, што самі з ёй не справяцца. Сацыяльныя наступствы праблемы часам пужаюць больш, чым яна сама, таму ў першую чаргу трэба працаваць з бацькамі, а пасля ўжо з дзецьмі, упэўнены спецыялісты. Хоць насамрэч усё не так жорстка, як здаецца.

— Калі вы звернецеся да нас да таго, як вас затрымалі, то ўся інфармацыя будзе ананімная і нікуды не пойдзе. Дапамога наша бясплатная, — запэўнівае Людміла Шпакоўская. — Тым больш што падлетак здымаецца з уліку, калі на працягу года не заўважаны ва ўжыванні наркатычных сродкаў, і ў яго біяграфіі не застаецца гэтага факта. І ўрэшце, што лепш: калі дзіця будзе стаяць на ўліку або калі яно памрэ?

## ДЗЕЦІ КРЫЧАЦЬ ПРА ДАПАМОГУ

У дыспансеры існуе такая форма работы, як школа стасункаў з дзецьмі для бацькоў. Прычым яна для бацькоў усіх дзяцей, а не толькі залежных, каб таты і мамы ведалі, на якія праявы і асаблівасці пераходнага ўзросту варта звярнуць увагу, што адбываецца з дзіцем, якія ў яго перыяды сталення.

— Калі да нас ананімна прыходзяць бацькі, якія падазраюць, што іх дзіця ўжывае псіхатропы, яны акрэсліваюць пэўныя аспекты. Аднак практыка паказвае, што тата і мама кажуць адно, а калі прыходзіць дзіця, карціна можа стаць зусім іншай, — кажа спецыяліст. — Маці сцвярджае, што толькі аднойчы застала малога, а ён насамрэч ужо год ужывае. Нават тым дзецям, якія ў нас назіраюцца, мы не можам дапамагчы паўнавартасна, бо палову інфармацыі ўтойваюць бацькі, палову — дзеці.

Дзіця сваімі паводзінамі спрабуе прыцягнуць да сябе ўвагу бацькоў, асабліва калі гэта падлетак ці ў сям'і пэўныя праблемы. Дзеці літаральна крычаць пра дапамогу, але родныя іх не чуюць, сцвярджае Людміла Шпакоўская:

— Бацькі часта не хочуць ісці да спецыялістаў. Нават калі яны разам з малым прыходзяць у камісію па справах непаўналетніх і нарколаг дае ім запрашэнне прыйсці да нас, дзіця ў дыспансеры з'яўляецца адно. У выніку хоць падлетак і гатовы мяняцца, праз тры дні ён прыходзіць і кажа, што ў яго ўсё добра і нічога больш не трэба. Значыць, сітуацыя ў сям'і не мяняецца.

## ЗАМЕНА ЦЫГАРЭТ ЦІ ЗАМАХ НА ЖЫЦЦЁ?

Пакуль у Беларусі не з'явіліся спайсы (у 2013-м), з праблемай наркаманіі сітуацыя была больш-менш спакойная, кажуць спецыялісты. Спайсавая ж хваля на парадак павялічыла колькасць залежных падлеткаў. Дзякуючы прынятым на дзяржаўным узроўні жорсткім мерам, рабоце псіхолагаў, педагогаў, нарколагаў і іншых спецыялістаў, а таксама прафілактычным праектам для дзяўчат, юнакоў, першакурснікаў ВНУ і іншых навучальных устаноў яна паступова адступіла.

Аднак цяпер з'явілася новая навала — снюсы, якія замяняюць цыгарэты і нібыта шкодзяць менш, бо не дымяць.

— Снюсы, як і спайсы калісьці, сёння не забаронены. У іх няма тытуню, але ёсць нікацін — тое самае наркатычнае рэчыва, якое фарміруе залежнасць. У адным такім пакецыку нікаціну больш, чым у самай моцнай цыгарэце, — папярэджвае прадстаўніца дыспансера. — А ўтрымліваюць за губой яго 20—30 хвілін, што таксама значна даўжэй, чым проста пакурыць, — значыць, нікаціну трапляе больш, і залежнасць яшчэ горшая. Акрамя таго, ніхто не ведае, якія араматызаваныя дабаўкі ўваходзяць у склад снюсаў. А яны могуць выклікаць у тым ліку алергічную рэакцыю: і гіпертанічны крыз, і анафілактычны шок. У снюсы дадаюцца рэчывы, якія валодаюць канцэрагеннымі ўласцівасцямі: каля 30 хімічных рэчываў, здольных выклікаць анкалогію.

Ужыванне снюсаў небяспечнае менавіта для падлеткаў, бо ўздзеянне гэтай «хіміі» замаруджвае рост, парушае кагнітыўныя функцыі, зніжае памяць і фізічную цягавітасць. Дзіця можа знаходзіцца ў стане эйфарыі, якая нагадвае наркатычнае ап'яненне, пасля чаго пераходзіць у агрэсію і зменяецца пасіўнасцю. У малога зніжаюцца апетыт і паспяховасць.

— Ніхто не ведае дзіцяці лепш, чым мама, і як толькі яна западозрыць, што нешта не так, — адразу трэба ісці менавіта да нарколагаў, — раіць Людміла Шпакоўская. — Быў выпадак, калі да нас прыйшла мама семікласніцы, якая трапіла ў рэанімацыю. У арганізме дзяўчыны знайшлі амфетаміны і алкаголь. Калі спыталіся ў матулі, як яна нічога не заўважала, аказалася, што звярталіся да псіхолага. А той сказаў не турбавацца, бо гэта пераходны ўзрост. У нашых жа псіхолагаў у дыспансеры ўжо спрактыкаванае вока, яны нават проста ў транспарце могуць заўважыць такіх падлеткаў.

## НАРКОТЫК — СПАЖЫВЕЦ — НАВАКОЛЛЕ

Дарослыя наркаманы, якія лечацца ад залежнасці, — гэта ў асноўным працаздольныя людзі ад 25 да 35 гадоў. Большасць з іх кажа, што пачалі ўжываць яшчэ падлеткамі. Вельмі рэдка чалавек, якому за 30, ужо сфарміраваны як асоба, мае пэўныя жыццёвыя ўстаноўкі, сям'ю, пачынае ўжываць наркотыкі, гавораць спецыялісты.

— Дарослыя праз залежнасць атрымліваюць масу медыка-сацыяльных праблем. Гэта распаўсюджванне ВІЧ-інфекцый, зніжэнне працаздольнасці, спосаб жыцця, які спрыяе крымінальным дзеянням, страта сацыяльных сувязяў і былога кола зносін, разбурэнне сем'яў, урэшце, ранняя смерць, — характарызуе сітуацыю **Алена СВІРЫДАВА, загадчык 17-га наркалагічнага аддзялення для лячэння асоб, якія пакутуюць на залежнасці ад псіхаактыўных рэчываў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя.** — Атрымліваецца кола з трох удзельнікаў: псіхаактыўнае рэчыва — наркаспажывец — навакольнае асяроддзе (сям'я, сябры). Падчас прафілактычнай работы трэба ўздзейнічаць на ўсіх. А бацькі прыводзяць да нас 18-19-гадовых людзей і кажуць: маўляў, хворы ён, лячыце яго, а мы ў гэтым удзельнічаць не будзем.

З дзецьмі-падлеткамі трэба гаварыць пра наркотыкі да таго, як яны пачалі іх ужываць. Лепш шчыра расказаць, што такая праява ёсць і яна кепская, каб у малога выпрацаваўся свой погляд на гэтае пытанне, чым рабіць выгляд, што ўвогуле не існуе ніякай праблемы і бяда іх міне, раіць урач.

## ПРАЦАТЭРАПІЯ ПА ЖАДАННІ

А яшчэ варта заняць падлеткаў працай, каб у іх не было думак, што ім няма чаго рабіць, упэўнена **Жана ШЧАМЯЛЁВА, кансультант упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі.** Ведамства актыўна падключылася да прафілактыкі наркаманіі шляхам дапамогі ў працаўладкаванні падлеткам падчас канікул і дарослым, якія пакутуюць ад залежнасці.

— Залежныя ад наркаманіі і п'янства людзі звычайна маюць досыць нізкую працоўную матывацыю. Іх ледзьве не за руку трэба вадзіць. Сёлета да нас звярнулася дзевяць чалавек-наркаманаў (людзі ад 40 да 50 гадоў). З дзевяці дайшлі да работадаўца толькі двое, — падкрэслівае яна.

Падчас летніх канікул падлеткам прапануюць часовае працаўладкаванне. Сёлета 135 хлапцоў і дзяўчат, якія звярнуліся ва ўпраўленне, атрымалі пастаянную работу. А ўсяго за 2019-ы намаганнямі органаў па занятасці насельніцтва атрымала работу 28,9 тысячы навучэнцаў. 90 % з іх — гэта школьнікі да 18 гадоў.

— Наша работа скіравана на працаўладкаванне менавіта вучняў. На гэта штогод выдзяляюцца грошы. У сярэднім школьнікі атрымліваюць каля 250 рублёў, — удакладняе Жана Шчамялёва. — Рабочыя месцы даюцца перш за ўсё катэгорыям дзяцей, якія патрабуюць павышанай увагі: стаяць на ўліку, са шматдзетных або няпоўных сем'яў, маюць праблемы з паводзінамі. І такая работа праводзіцца ва ўсіх раёнах краіны.

**Ірына СІДАРОК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




## ЯЗЫКУ ДАЙ ВОЛЮ...

Даўно было, а помніцца — нібы ўчора. Далёкі 1957-ы. Абарона дыпломаў. Да нас, будучых інжынераў, патрабаванні вельмі строгія і, вядома ж, роўныя, хоць сярод студэнтаў — не толькі ўчарашнія школьнікі, але і сапраўдныя франтавікі. Навука ім давалася, вядома ж, цяжэй — плячо падстаўляла моладзь... Затое «дзяды» вучылі яе жыццю, засцерагалі ад дрэнных учынкаў. Адзінае, не заўсёды.

У той дзень (дарэчы, досыць гарачы) абараняліся якраз маладыя Генадзь і Антось. Адстраляліся абодва, прычым паспяхова! Гэта значыць, за спінамі пяць гадоў вучобы, у кішэнях, можна сказаць, дыпломы інжынераў, а на грудзях — ромбікі аб вышэйшай адукацыі (тады іх з гонарам насілі)...

Ну як такое было не адзначыць?!

Хлопцы — як потым прызналіся — выпілі «ярша» і пайшлі гуляць па вуліцах сталіцы.

Хадзілі доўга і — шчаслівыя — нейк не заўважылі, што іх агарнула ноч, што ногі аж гудуць ад стомы, што хочацца піць... Прычым вельмі, а ў горадзе пасля 12 ночы тады зачынялася ўсё — нават вады не вып'еш, хіба...

На вочы хлопцам папалася бочка з квасам. Паварушылі-пакраталі — не пустая, унутры нешта ёсць. А вось як дастаць, калі ўсё на замку?!

— Давай да інтэрната падкоцім. Там нешта прыдумаем, — прапанаваў Антон.

Генадзь дастаў з-пад кола камень, упёрся ў жалезны бок і... Па роўным бочка кацілася больш-менш лёгка, а вось у горку хлопцы самі ўжо не здужалі. Добра, што побач стаяў... міліцыянер. Хлопцы яму:

— Браток, дапамажы...

— А куды вы яе коціце? — пыталася той.

— У інтэрнат... Хлопцы піць хочуць.

— Дык жа нельга. Дзяржаўная ўласнасць.

Слова за слова — канфлікт: міліцыянер тую бочку трымае, Генадзь з Антонам піхаюць...

Ну і «дапіхаліся» ўрэшце да таго, што апынуліся ў аддзеле міліцыі.

Дзяжурны там нехта з гумарам: пасмяяўся з «даклада» маладзенькага сяржанта і, відаць, адправіў бы хлопцаў спаць, калі б яршыцца не сталі. Маўляў, як так — іх, без пяці хвілін інжынераў, ды сасункамі назвалі! Значыць, павінны прабачэння прасіць!

Тут ужо сяржант не вытрымаў, сказаў:

— Я рапарт падам, калі вы, таварыш лейтэнант, гэтых дваіх адпусціце.

...Такім чынам нашы, можна сказаць, дыпламаваныя інжынеры атрымалі па пятнаццаць сутак і ўжо назаўтра падмяталі вуліцы.

Пачуўшы пра гэта, аднагрупнікі-франтавікі надзелі свае парадныя касцюмы і рушылі на выручку. Толькі дэлегатаў ніхто і слухаць не стаў: «машына» ўжо закруцілася... А між тым праз два дні дыпломнікам трэба выязджаць на выніковыя ваенныя зборы. І гэта ўжо не жартачкі: той, хто спозніцца, іх не пройдзе, рызыкуе застацца не толькі без воінскага звання, але і без дыплома.

...Вызваліць пацярпелых пашчасціла толькі выкладчыку ваеннай кафедры. Так што «дзве дзюркі ў носе, і скончылося», — як казаў вядомы герой «Паўлінкі»... Можа, нават забылася б, каб на адной з сустрэч аднакурснікаў нейкія жартаўнікі не выставілі паменшаную копію бочкі з квасам і наклеенным побач здымкам сяржанта. Вось дзе рогату было!

А потым, магчыма, і высноў, што язык можа давесці не толькі да Кіева, але і да няволі.

**У. Сяргейчык,**
*г. Магілёў.*

## ХВАЛІ ДЗЕНЬ ВЕЧАРАМ

Жыццё (а доўгае — і тым больш) на падзеі багатае: нейкія з іх сціраюцца з памяці, нейкія застаюцца, і ўжо, мусіць, да скону. З ліку такіх — сакавік 1953-га, дзень, калі памёр Сталін.

Помню як зараз, што аплаквалі яго і ў вялікіх гарадах, і ў маленькіх вёсках. У нашай школе, напрыклад, спынілі заняткі, усіх вучняў вывелі з класаў у доўгі калідор, са слязьмі аб'явілі, што ў краіне — велізарнае, непапраўнае гора, што нам трэба плакаць...

Хоць пра гэта маглі і не казаць, бо што заставалася дзецям, калі побач не хавалі сваіх слёз настаўнікі, калі іх не саромеўся нават дырэктар школы...

Пасля гэтай жалобнай лінейкі я, помню, куляй прынеслася дамоў, каб расказаць навіны сваім сямейнікам.

Тыя ўважліва мяне паслухалі, але, што здзівіла, змаўчалі.

Я тады пачала яшчэ раз: ну як вы не разумееце — гэта ж сам Сталін...

— Ну памёр дык памёр, — нарэшце азваўся дзядуля, які сядзеў каля грубкі і плёў лапці.

— А чаму вы не плачаце? — папыталася я.

— Дык нехта ж кожны дзень памірае, — уздыхнуў мой дзед. — Усіх аплакваць і слёз не хопіць.

— А Сталін — не ўсе! — стала даводзіць я. — У школе сказалі, што ён ва ўсім свеце найлепшы правадыр, што такога больш ніколі не будзе!

— Будзе, унучка мая, — зноў уздыхнуў дзядуля. — Не такі, дык іншы. Бачыла, колькі ў клубе на сцяне партрэтаў вісіць? Не злічыць! Шмат хто здаваўся найлепшым, а потым... Паглядзім, што пра гэтага па смерці запяюць... Адно я добра ведаю: без нячысціка балот не бывае. Знойдзецца нехта лепшы — для вярхоў, а для нас... Я вось, унучка, да рэвалюцыі ў ботах хадзіў, а цяпер, бачыш, лапці пляту. І было б з чаго: за працадні вярча лазы не купіш.

Я змоўкла, бо крыць, як кажуць, не было чым.

І сапраўды, у хуткім часе дарослыя сталі пераказваць даклад Мікіты Хрушчова аб культе асобы, сярод людзей пачаліся размовы аб злачыннай палітыцы таго правадыра, і мне заставалася толькі дзівіцца, у якой жа хлусні мы жылі...

Карацей, дзядулевы словы пра балота і чорта я ўспамінала потым не раз.

**Ніна Кандрашонак,**
*г. Петрыкаў.*

## ЛЮДЗІ — ДОБРЫЯ

Чалавек, згадзіцеся, істота замкнёная, кожная ў сваім ачэрчаным крузе, вялікім ці малым — у залежнасці ад характару. Але ж агулам, за шырмай знешняга «пафігізму», людзі хаваюць у сабе вялікія душэўныя скарбы і нават праяўляюць іх — пры выпадку.

Тады нашай дачушцы было мо гадкі са два, і мы з жонкай вырашылі паказаць ёй жывых экзатычных жывёл, звазіць у перасоўны звярынец, які атабарыўся ля сталічнай Камароўкі.

Для гэтага, помню, мы апранулі дзіця як мага цяплей (быў самы разгар зімы), злавілі таксі, у добрым гуморы паехалі. І нездарма, бо навокал — было... шчасце! Розных цікавых звяркоў і звяроў — проста не злічыць!

Мы найперш рушылі карміць вярблюда. Дачушка праз металічныя пруты працягнула яму нейкі сухарык, смешная вярблюджая морда нахілілася над ім, падабрала сваімі пяшчотнымі вуснамі і захрумсцела...

Гэты кранальны момант мне пашчасціла зняць на фота і якраз тады, у вочка аб'ектыва, згледзець, што правая ножка ў малой... без валёнка. Дзе дзеўся — ну вядома ж, згубіўся, і хутчэй за ўсё — у таксі: мы спяшаліся адпусціць машыну... А значыць, шукай цяпер ветру ў полі...

Мабільнікаў тады не было, нумар машыны мы, вядома ж, не помнілі (хто мог думаць, што ён спатрэбіцца?)... Але ж на ўсякі пажарны вярнуліся на тое месца, дзе выходзілі з таксі, сталі шукаць прапажу... Як тут дзіва дзіўнае — нехта сігналіць ды весела крычыць: «Э-э, людцы, ці не ваш я валёнак важу? Забярыце, а то мне малаваты, а дзяцей пакуль што няма... Ды і не парны абутак».

Ад здзіўлення ў нас, што называецца, і мову адняло. Кінуліся дзякаваць, але кіроўца і слухаць не стаў: проста паехаў далей — задаволены, відаць, не менш, чым мы, бо паспагадаў чужой, хай маленькай, бядзе, а гэта (як тады гаварылі) учынак, прычым сапраўднага савецкага чалавека. («Несавецкі», убачыўшы ў машыне дзіцячы валёнак, мог бы проста выкінуць яго і забыцца...)

Словам, цудоўны чалавек быў! І, вядома ж, не ён адзін. Аднаяскоўцы, помню, на пачатку зімы дасталі дублёнку для свайго сына. Той, студэнт, вучыўся ў інстытуце ў Мінску. А я туды якраз ехаў... Ну, мяне і папрасілі: зрабі, маўляў, ласку — завязі, а то ж мерзне дзіця.

Ну як тут адмовіш? Пагадзіўся я, хоць не хацеў. Па-першае, пакет з той дублёнкай быў вельмі вялікі, а ў мяне і свае дзве сумкі (адна — з салам ды мясам), па-другое, рукі ў мяне толькі дзве...

Тым не менш (малады быў, не хілы) дацягнуў я гэтае багацце да цягніка, сяк-так уладкаваўся, прычым пакунак з кажухом запіхнуў на трэцюю паліцу, каб, крый божа, не скралі. Прыехаў у Мінск. На вакзале выйшаў з цягніка — з салам, з мясам, але... без дублёнкі.

Пра яе ўспомніў (і ледзь прытомнасць не страціў!) толькі тады, калі мой хуткі цягнік ужо матаў кіламетры ў бок Масквы...

Калі трохі ачомаўся, на ватных нагах рушыў да дзяжурнага па вакзале.

Той паглядзеў на мяне і ўсё, відаць, зразумеў: па нейкай спецсувязі звязаўся з начальнікам цягніка, шчыра, як для сябе, папрасіў, каб ён «арганізаваў пошук». І — што вы думаеце — мая згуба знайшлася, на той самай трэцяй паліцы! У Смаленску яе перадалі дзяжурнаму па вакзале, ён, у сваю чаргу, — аднаму з праваднікоў цягніка, які ішоў на Мінск.

Карацей, пад раніцу я ўжо сустракаў сваю дублёнку-вандроўніцу з запіскай ад дзяжурнага па сталічным вакзале і самымі цёплымі думкамі аб тым, колькі ж неабыякавых людзей прычынілася да гэтай справы, захацела мне, зусім незнаёмаму чалавеку, дапамагчы.

...Гэта толькі два падобныя выпадкі, а ўсіх, калі ўспомніць, прыгадаецца шмат. І атрымаецца, што свет (прабачце за паўтор) трымаецца менавіта на добрых людзях.

Іншая рэч, што адкапаць зярняткі дабраты часам бывае цяжка: могуць спатрэбіцца альбо маленькі дзіцячы валёначак, альбо вялікі мужчынскі кажух.

**Іван Гаральчук,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# Трыццаць тры няшчасці

## Ісціну пра бясплатны сыр ніхто не адмяняў

ЕДУ нядаўна ў вячэрнім тралейбусе — раптам кліча нехта па імені. Агледзелася вакол — пазнала: Ліда, гадоў на пяць старэйшая дзяўчынка, з якой гулялі разам, калі прыязджалі «на пасёлак» да маміной цёткі Веры, пасля перасякаліся неяк па маладосці на вяселлях сваякоў-суседзяў... З апошняй нашай сустрэчы мінула гадоў дваццаць, Ліда з худзенькай дзяўчынкі ператварылася ў даволі мажную смяшлівую кабету. З нязменнай усмешкай на твары, пакуль ехалі да майго прыпынку, яна расказала мне пра свае «трыццаць тры няшчасці», якія абышліся ёй у кругленькую суму. Ужо развітваючыся, папрасіла: «Ты ж, казалі, у газеце працуеш? Напішы, калі ласка, пра тое, як я папалася, можа, якая дурніца даверлівая пачытае ды спыніцца, пакуль не позна...»

САПРАЎДЫ, пісаць ёсць пра што. Бо мая даўняя знаёмая постбальзакаўскага ўзросту ўмудрылася ўляпацца ў самыя тыповыя ў свой час махлярскія схемы. Прычым многімы лік тут дарэчы.

**БЛІЗНЯТЫ.** У цэлым тыдзень спрыяльны для працы і творчасці. У асабістым жыцці наспяваюць важныя перамены. Прычым да лепшага. Вы з радасцю будзеце выконваць творчую работу, нават без карыслівых мэт. Грошы і так з'явяцца. Ваш аўтарытэт прыкметна ўзрасце, свабода выбару застанецца за вамі. Пятніца можа стаць днём падарожжаў і любоўных прыгод.



**РАК.** Тыдзень можа нагляднa прадэманстраваць усе вашы ўнутраныя комплексы. Што ж, тым лягчэй будзе з імі змагацца. Можаце адчуць абыякавасць да ўсіх спраў. У такой сітуацыі процілаказаны сыход у свет ілюзій. Лепш працаваць і праявіць сябе. Ёсць верагоднасць скарыць начальства і калег цікавай ідэяй. У пятніцу кампраміс не для вас, бо можа рэзка абмежаваць вашу свабоду. Зрэшты, пад Новы год здараюцца цуды.



**ЛЕЎ.** Пачынайце змяняць свае погляды на жыццё і пазбаўляцца ад старых стэрэатыпаў. Добры час для пабудовы планаў на новы год, яны маюць шанцы спраўдзіцца. Не бойцеся брацца за доўгатэрміновыя праекты. Не цяпер вельмі пераканаўчыя і прывабныя. Не забывайце аб прыемным свецкім жыцці. Але будзьце асцярожныя са спакуслівымі прапановамі.



**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні вас, хутчэй за ўсё, чакае шмат работы. Калі вы з ёй і справіцеся, то толькі дзякуючы высокаму аўтарытэту сярод тых, каго можаце паклікаць на дапамогу. Ёсць небяспека, што маштабнасць уласных ідэй перашкодзіць рэальна ацаніць свае магчымасці. Паспрабуйце хоць бы ў канцы тыдня знайсці час, каб падумаць пра надыходзячыя святы, спланаваць адпачынак і набыццё падарункаў.



**ШАЛІ.** На гэтым тыдні вы здольныя лёгка абяззброіць крытычна настроеных людзей сваёй увагай. Выніковасць дзеянняў, як абяцаюць зоркі, прыкметна ўзрасце, вы многае паспееце зрабіць. Адкіньце непатрэбныя сумневы, інакш на перашкоду ўласнага супрацьву выдаткуеце занадта шмат намаганняў. Пазбягайце асабістых размоў на рабоце. Цяпер лепш абысціся без любоўных трохкутнікаў. І не паддавайцеся на эмацыянальныя правакацыі.



**СКАРПІЁН.** Тыдзень чакаецца гарманічны і паспяховы. Будзеце з задавальненнем жыць, працаваць, кахаць. Сіл будзе хапаць на рэалізацыю ўсяго таго, што вырашыце здзейсніць. Значна ўзрасце асабістая энергетыка, таму будзеце вельмі артыстычныя і лёгкія на пад'ём. Сплануйце сустрэчу Новага года з каханым чалавекам.



**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні не варта планаваць вырашэння жыццёва важных задач, лепш, калі ёсць магчымасць, выдаткаваць пабольш часу для адпачынку. На рабоце неабходна паказаць сваю сабранасць і пунктуальнасць. Верагодна новае складанае заданне, з якім вы хутка справіцеся. Могуць узнікнуць невялікія сямейныя праблемы. Лепш нікуды не спяшацца, падумайце, перш чым штосьці сказаць, ці распачаць нейкае дзеянне.



**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні не варта раскідвацца па дробязях або стараца паспець перарабіць усе справы адразу, гэта будзе толькі тармазіць работу. Не бойцеся сказаць «не», гэта толькі дадасць вам значнасці. У сераду можаце сутыкнуцца з нядобразычлівасцю. У другой палове тыдня давядзецца разрываца паміж кар'ернымі памкненнямі і сямейнымі інтарэсамі. Знайдзіце час на тое, каб правесці генеральную ўборку перад святамі.



**ВАДАЛІЎ.** Заплюшчыце вочы, прыслухайцеся да сябе, і тады адчуеце, у якую плынь вам неабходна ўвайсці, каб атрымаць жаданае. Паспрабуйце не даваць ніякіх абяцанняў. Будзе складана стрымаць сваё слова. Ахапіць неабсяжнае немагчыма, таму завяршайце толькі тое, што па сілах. Першая палова тыдня можа быць звязаная з досыць складанай работай, але да выхадных напружанасць спадзе.



**РЫБЫ.** На гэтым тыдні вас ахопіць жаданне працы. Спраўдзіцца ў сутнасць рэчаў і ў думкі навакольных. Вы нездарма падазраяце другое дно. Не верце на слова. Вы многае ўбачыце з новага пункту гледжання, але не захапляйцеся аналізам на шкоду актыўнай дзейнасці. У аўторак не спазняцца, вас будуць ацэньваць па пунктуальнасці і адказнасці. Хтосьці побач з вамі здольны лёгка выйсці з раўнавагі, не дайце яму нагоды. У выхадныя купіце сабе святочны ўбор.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.20 | 16.47 | 7.27 |
| Віцебск — | 9.17 | 16.29 | 7.12 |
| Магілёў — | 9.10 | 16.37 | 7.27 |
| Гомель — | 8.58 | 16.42 | 7.44 |
| Гродна — | 9.34 | 17.04 | 7.30 |
| Брэст — | 9.26 | 17.13 | 7.47 |

### Месяц

*Поўня 12 снежня.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

**Пр.** *Андрэя Першазванага.*
**К.** *Люцыі, Юліі, Пятра, Уладзіміра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў




## Даты | Падзеі | Людзі

### 13 СНЕЖНЯ




**1904** год — нарадзіўся Мікалай Мікалаевіч Воронін, рускі археолаг і гісторык мастацтва, доктар гістарычных навук, прафесар. Скончыў Ленінградскі ўніверсітэт. Вывучаў гісторыю культуры і дойлідства гарадоў Старажытнай Русі. У 1949 годзе праводзіў раскопкі на Замкавай гары ў Гродне. Даследаваў будынкі і фрэскі Бялыніцкага Барысаглебскага манастыра ў Полацку, дойлідства Смаленска XII—XIII стагоддзяў. Арганізатар выдання, рэдактар і адзін з аўтараў «Гісторыі культуры Старажытнай Русі». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Ленінскай прэміі. Памёр у 1976 годзе.



**1919** год — нарадзілася Валяр'яна Канстанцінаўна Жолтак, беларуская мастачка, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Працавала ў розных жанрах станковага жывапісу. Аўтар сюжэтна-тэматычных карцін: «Разліў на Бярэзіне», «Вязынка», «Вяча», «Восеньская сімфонія», «Макі», «Чырвоная рабіна». Памерла ў 2000 годзе.

**1920** год — на другім Усебеларускім з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў прынятыя дапаўненні да Канстытуцыі БССР 1919 года і ратыфікаваны прэлімінарны дагавор паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. З'езд выказаўся за перавод усіх дзяржаўных устаноў на беларускую мову.

**1924** год — нарадзіўся Мікалай Паўлавіч Андрыевіч, удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Магілёўскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Лічыўся адным з найлепшых падрыўнікоў. Загінуў у 1944 годзе ў час «рэйкавай вайны» пры падрыве варожага эшалона.

**1924** год — нарадзілася Сусанна Міхайлаўна Самбук, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук. Даследавала гісторыю Беларусі XIX — пачатку XX стагоддзя: праблемы сацыял-дэмакратычнага, сялянскага і рабочага руху, палітыкі царызму, грамадска-палітычнай думкі, народніцтва і нацыянальнага руху.




**1577** год — англійская эскадра на чале з вядомым піратам Фрэнсісам Дрэйкам адплыла з Плімута. Першапачатковай мэтай плавання быў набег на ціхаакіянскія берагі Іспанскай Амерыкі. Але некалькі нечакана падарожжа завяршылася кругасветкай, калі ў верасні 1580 года карабель «Залатая лань» вярнуўся ў той жа Плімут. Плаванне Дрэйка стала другім кругасветным падарожжам, і ён ставіў сабе ў асаблівую заслугу тое, што стаў першым камандзірам, які распачаў і паспяхова завяршыў кругасветнае плаванне.

**1684** год — нарадзіўся Людвіг Хольберг, нарвежска-дацкі пісьменнік, драматург, філосаф, гісторык. Лічыцца заснавальнікам новай дацкай і нарвежскай літаратуры. Памёр у 1754 годзе.



**1769** год — пачалося першае канцэртнае турнэ 13-гадовага Вольфганга Амадэя Моцарта па Італіі. Яно працягвалася 15 месяцаў.

**1884** год — у Бруселі заснавана Міжнародная асацыяцыя чыгуначных кангрэсаў.

**1929** год — нарадзіўся Крыстафер Пламер, канадскі кінаакцёр. Здымаўся ў фільмах «Гукі музыкі», «Ватэрлоа» і іншых.

## УСМІХНЕМСЯ

Максім Галкін — як бурштынавыя карáлі. Таксама вісіць на шыі ў пенсіянеркі.

**— Эх, вось нарадзіла б у 18, цяпер бы ўжо посуд сама не мыла.**

Ёсць чатыры тыпы дзяўчат:

1. Няхай не нафарбуюся, але пасплю.
2. Няхай не нафарбуюся, але паем.
3. Няхай не пасплю і не паем, але нафарбуюся.
4. Усяды спазнюся, але пасплю, паем і нафарбуюся.

**Аказваецца, урачы, калі нап'юцца, пішуць разборлівым почыркам.**

Як растлумачыць жонцы, што, нягледзячы на тое, што сыну ўсяго тры месяцы, ён хоча, каб яго тата пагуляў у прыстаўку ўжо зараз?..

**— Ты дзяўчына, таму павінна гаварыць пяшчотна і ласкава.**
**— Табе зубік выбіць?..**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае міністэрствам інфармацыі рэспублікі беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.
прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 4268.
Нумар падпісаны ў 19.30 12 снежня 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

13 снежня 2019 г. № 49 (534)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ



Фота БелТА.

# КРАІНА ПАСПЯХОВАГА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

## Саветы па развіцці прадпрымальніцтва сталі працаваць больш эфектыўна і вынікова

**Бізнес — невялікі, унёсак у эканоміку — буйны. Значную ўвагу на развіццё малога і сярэдняга прадпрымальніцтва пачалі звяртаць даўно, прычым на самым высокім дзяржаўным узроўні. Яшчэ ў 2010 годзе Прэзідэнт падпісаў Дырэктыву № 4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці», а ў 2017-м — Дэкрэт № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва». Летась ініцыятыва знайшла працяг на месцах: былі створаны рэгіянальныя саветы па развіцці прадпрымальніцтва. На жаль, у апошнім выпадку не заўсёды выконваліся патрабаванні яшчэ адной Дырэктывы — № 2, якая прадугледжвала «ўсеагульны, татальны характар» дэбюракратызацыі.**

Незалежныя эксперты па выніках даследавання зрабілі вывад, што дагэтуль дзейнасць саветаў насіла хаатычны і фармальны характар. Такую ж ацэнку далі і чыноўнікі: летам у Міністэрстве эканомікі адзначалі, што праз адсутнасць адзінага парадку рэгулявання на заканадаўчым узроўні работа саветаў у ранейшым фармаце не дазваляла ім працаваць эфектыўна, дзейнасць іх мела разрознены характар. Мэты і задачы саветаў па развіцці прадпрымальніцтва, іх склад, рэгламент працы маглі істотна адрознівацца нават у межах адной вобласці.

Не ва ўсіх палажэннях аб саветах было пазначана, што задачамі павінны быць разгляд і вырашэнне праблемных пытанняў бізнесу. Аналагічная сітуацыя назіралася ў пытаннях фарміравання складу саветаў. У асобных галінах практычна ўсе саветы ўзначальвалі прадстаўнікі бізнесу, у асобных — кіраўнікі альбо намеснікі кіраўнікоў выканкамаў.

Для вырашэння ўсіх пералічаных праблем у верасні гэтага года зацверджана Тыповае палажэнне аб савеце па развіцці прадпрымальніцтва. Як паўплывала яно на работу савета і яе вынікі? Наколькі сёння збалансаваны склад абласных і раённых саветаў па развіцці прадпрымальніцтва?

З гэтымі і іншымі пытаннямі «МС» звярнулася да Міністэрства эканомікі Беларусі. Рэдакцыя мае пісьмовы адказ на запыт. Вывучаем дакумент разам.

### НЕ ТУРБУЮЧЫ ЎРАД

Цяпер склады ўсіх рэгіянальных саветаў сфарміраваны ў асноўным з ліку прадстаўнікоў мясцовага бізнесу і аб'яднанняў прадпрымальнікаў, суб'ектаў інфраструктуры падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, а таксама самазанятых асоб. Менавіта такі парадак фарміравання складу савета ўстаноўлены тыпавым Палажэннем аб абласным (раённым) савеце па развіцці прадпрымальніцтва, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 9 верасня 2019 года № 604. Узначальваюць саветы старшыні выканкамаў (альбо іх намеснікі, адказныя за развіццё эканомікі), на якіх ускладзеныя таксама функцыі кантролю за выкананнем рашэнняў савета.

стар. 4

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Задача № 1



Спікер верхняй палаты Наталля Качанава — сенатарам: «Самае галоўнае — стаўленне да людзей». стар. 2

### Падтрымалі прэтэндэнтаў



На першай сесіі Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання выбраны старшыні Пастаянных камісій. стар. 3

### Як актывізаваць ініцыятыву



Аб гэтым раіліся дэпутаты Малярыцкага раённага Савета дэпутатаў. стар. 14

### Самыя актыўныя



Узнагароджаны пераможцы конкурсу па падтрымцы прадпрымальніцтва. стар. 15

### Ліфт для школы



У выніку супрацоўніцтва органаў мясцовай улады з Еўрапейскім саюзам нараджаюцца цікавыя праекты. стар. 16

## Наталля КАЧАНАВА:

# «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ЛЮДЗІ І СТАЎЛЕННЕ ДА ІХ»

### Спікер верхняй палаты акрэсліла асноўныя задачы, якія стаяць перад сёмым склíканнем Савета Рэспублікі

**Падчас першай сесіі, на якой было абранае кіраўніцтва верхняй палаты парламента, Наталля Качанава падзякавала ўсім сенатарам за аказаны давер і запэўніла, што ўсе свае вопыт, сілы і веды накіруе на тое, каб рэалізаваць пастаўленыя перад Саветам Рэспублікі задачы.**



### Асноўны кірунак дзейнасці — заканатворчасць

— Савет Рэспублікі з'яўляецца адным з найважнейшых дзяржаўных інстытутаў нашай краіны, ад эфектыўнасці якога шмат у чым залежыць развіццё дзяржавы. На новай пасадзе я буду, як і раней, прытрымлівацца тых прынцыпаў, якія адзначыў кіраўнік дзяржавы. Перш за ўсё — суверэнасць і незалежнасць, — падкрэсліла яна.

Самае галоўнае, упэўнена спікер Савета Рэспублікі, — гэта людзі і справядлівае стаўленне да іх, а ўсе рашэнні, што прымаюцца, павінны быць на карысць дзяржавы.

Яна засяродзіла ўвагу, што для рэалізацыі асноўных кірункаў дзяржаўнай палітыкі неабходна захаваць пераемнасць вопыту заканатворчасці, рэгіянальнай і міжнароднай дзейнасці шостага склікання Савета Рэспублікі.

— Трэба будзе паслядоўна выканаць задачы, якія паставіў перад намі кіраўнік дзяржавы. Ён дакладна вызначыў, як павінны працаваць парламентарыі ў сучасных умовах, — падкрэсліла Наталля Качанава і акцэнтавала ўвагу на тым, што асноўны напрамак дзейнасці Савета Рэспублікі — заканатворчасць. Менавіта ў ёй павінны быць адлюстраваныя ўсе найважнейшыя сферы жыццядзейнасці дзяржавы: эканоміка, сацыяльная сфера, ахова жыцця і здароўя, навука, адукацыя, культура, спорт, экалогія, міжнародная палітыка.

Гэта далёка не ўсе аспекты. Дабрабыт людзей залежыць у першую чаргу ад эканамічнай сітуацыі ў краіне. Таму важнымі кірункамі заканатворчай дзейнасці, на думку спікера верхняй палаты, у гэтай сферы застаюцца павышэнне эфектыўнасці эканомікі, стварэнне новых рабочых месцаў, развіццё дзелавой ініцыятывы, дыверсіфікацыя экспарту, умацаванне навукова-тэхнічнага патэнцыялу, інвестыцыі, лічбавізацыя.



### У прыярытэце — дэмаграфічная бяспека

Наталля Качанава звярнула ўвагу сенатараў на тое, што 2020-ы — завяршальны год пяцігодкі, а значыць, самы адказны і напружаны.

— Нас чакае вялікая работа над шэрагам законапраектаў, накіраваных на рэалізацыю Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны. Мы павінны захаваць сацыяльную скіраванасць дзяржаўнай палітыкі і традыцыйны ўклад грамадства, — адзначыла яна.

У прыярытэце трэба мець дэмаграфічную бяспеку — заканатворчая дзейнасць павінна быць накіравана на зацвярджэнне спрадвечных, нацыянальных каштоўнасцяў беларусаў: сям'і, абароны дзяцей, моладзі, павагі да старэйшага пакалення, захавання нацыянальнай культуры і патрыятызму, упэўнена Наталля Качанава.

— Магчыма, нам трэба будзе ўзяць удзел у глабальным праекце па ўдасканаленні Канстытуцыі. Адказнасць за гэтыя папраўкі і іншыя законы будзе насіць персанальны характар, — падкрэсліла выступоўца. — Мы павінны быць гатовыя да гэтага і выпрацаваць найбольш прымальныя варыянты змяненняў з улікам нацыянальных інтарэсаў і сучасных тэндэнцый.

### Законы павінны быць зразумелыя людзям

Наталля Іванаўна звярнула ўвагу прысутных і на яшчэ адзін важны кірунак дзейнасці парламента — работу з людзьмі:

— Якія б мы ні прымалі папраўкі або законы, у цэнтры ўвагі павінен быць чалавек, яго дабрабыт, стварэнне ўмоў для яго самарэалізацыі, — адзначыла яна. — Сенатары павінны добра ведаць сітуацыю ў рэгіёнах, праблемы, якія хвалююць людзей, і актуалізаваць іх у рабоце з законапраектамі. Вы гэтыя праблемы ведаеце, таму што прадстаўляеце ўсе рэгіёны нашай краіны.

Спікер Савета Рэспублікі падкрэсліла, што законы павінны быць зразумелымі людзям, распрацоўвацца, карэктавацца ў адпаведнасці з тым жыццём і тымі ўмовамі, якія існуюць. Сустрэчы з людзьмі ў калектывах, арганізацыях, установах, на прадпрыемствах, работа са зваротамі грамадзян, прамыя лініі, прыёмы па асабістых пытаннях — усё гэта, несумненна, прамы абавязак парламентарыяў. Дапамагаючы вырашаць праблемы канкрэтных людзей, ім неабходна падключаць да працэсу мясцовыя органы ўлады. Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што многія з дэпутатаў вельмі актыўныя, неабыякавыя да праблем людзей, таму іх патэнцыял трэба выкарыстоўваць больш эфектыўна, выбудоўваць прадукцыйнае ўзаемадзеянне мясцовых Саветаў з парламентам, урадам, дзяржорганамі для вырашэння важных стратэгічных дзяржаўных задач.

### Стасункі на міжнароднай арэне

Што датычыцца міжнароднай палітыкі, то неабходна, на думку спікера Савета Рэспублікі, працягнуць выбудоўваць дыпламатычныя адносіны з парламентамі іншых дзяржаў.

— Для нас важна захаваць і ўмацаваць блізкія сувязі з былымі рэспублікамі Савецкага Саюза. Асаблівую ўвагу варта ўдзяліць пытанням супрацоўніцтва з партнёрамі па Саюзнай дзяржаве. Праблемы ў развіцці інтэграцыйных працэсаў, у тым ліку ў сферы ўніфікацыі і гарманізацыі нацыянальных заканадаўстваў, вы ведаеце, — адзначыла Наталля Качанава і падкрэсліла, што сенатары павінны выразна адстойваць і прасоўваць нацыянальныя інтарэсы, а таксама выбудоўваць эфектыўнае ўзаемадзеянне і супрацоўніцтва з дзяржавамі Еўрасаюза і далёкай дугі.

— І самае галоўнае — захаваць пераемнасць, максімальна выкарыстаць патэнцыял, напрацаваны шостым скліканнем, — рэзюмавала яна.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**



**На здымку *(злева направа)*: старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Алег СУКОНКА.**

❍ У тэму

## ХТО ЎВАЙШОЎ У ПРЭЗІДЫУМ?

**Кіраўніцтва Савета Рэспублікі сфарміравана на першым арганізацыйным пасяджэнні сесіі сёмага склікання.**

Трэба сказаць, што дзеючы склад Савет Рэспублікі сёння — гэта 60 сенатараў. 56 чалавек абраны на пасяджэннях абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў, чатыры прызначаны Прэзідэнтам нашай краіны. Традыцыйна заканатворчая дзейнасць аб'ядноўвае найлепшых прадстаўнікоў сваіх рэгіёнаў (бо верхняя палата парламента — гэта орган тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. — **«МС»**): вопытных, дасведчаных, паважаных... Даярчы, працягнута і пераемнасць: 11 сенатараў прадстаўлялі інтарэсы сваіх рэгіёнаў у складзе Савета Рэспублікі шостага склікання.

У дзеючым складзе 26 чалавек маюць дзяржаўныя ўзнагароды, 14 — навуковыя ступені ці званні, два — члены-карэспандэнты Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, сем з'яўляюцца прафесарамі.

На першым арганізацыйным пасяджэнні сенатары абралі кіраўніцтва верхняй палаты парламента. У прэзідыум увайшлі спікер Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, віцэ-спікер Анатоль ІСАЧАНКА і новаабраныя старшыні Пастаянных камісій. Пазнаёмім з імі нашых чытачоў. Пастаянную камісію па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ўзначаліў Міхаіл РУСЫ, Пастаянную камісію па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці — Віктар ЛІСКОВІЧ, Пастаянную камісію па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве — Сяргей СІВЕЦ, Пастаянную камісію па эканоміцы, бюджэце і фінансах — Таццяна РУНЕЦ і Пастаянную камісію па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы — Сяргей РАЧКОЎ.

# НА ЧАЛЕ КАМІСІЙ

## Чатырнаццаць Пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі атрымалі кіраўнікоў

**На першай сесіі Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання выбраны старшыні Пастаянных камісій. У пасяджэнні, якое правёў старшыня ніжняй палаты парламента Уладзімір Андрэйчанка, узялі ўдзел усе 110 дэпутатаў. На кожную пасаду было вылучана па адной кандыдатуры, самаадводаў не здарылася. У падтрымку кожнага прэтэндэнта выступілі па некалькі дэпутатаў, а па выніках тайнага галасавання ніхто з будучых старшынь не атрымаў менш за сотню галасоў.**


Фота БелТА.

«У грамадстве сёння як ніколі запатрабавана забеспячэнне справядлівасці, балансу інтарэсаў дзяржавы і асобнага чалавека, які мусіць быць пачуты», — адзначыла ў сваёй прамове старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ.

Яна нагадала, што зараз дэпутаты Палаты прадстаўнікоў разглядаюць змяненні законаў па пытаннях выканаўчай вытворчасці, натарыяльнай дзейнасці. Хутка будзе разглядацца законапраект, які прадугледжвае комплексную карэкціроўку Грамадзянскага кодэкса. А ў перспектыве — праект адзінага Працэсуальнага кодэкса па грамадзянскіх і эканамічных справах.

«Гэта самая сур'ёзная навела ў заканадаўстве на постсавецкай прасторы», — падкрэсліла Святлана Любецкая.

Гаворка на пасяджэнні зайшла таксама пра геапалітыку і знешнія пагрозы. Бяспека пры гэтым пераклікаецца з усімі сферамі, ад эканомікі да СМІ, а на першы план выходзіць узаемадзеянне.

Па словах старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Алега БЕЛАКОНЕВА, наперадзе разгляданне ў другім чытанні новага законапраекта аб абароне персанальных даных, а таксама аб адзінай дзяржаўнай сістэме рэгістрацыі і ўліку правапарушэнняў, удасканаленне закона аб аператыўна-пошукавай дзейнасці і іншыя задачы.

У падтрымку кандыдатуры Алега Белаконева «ваенныя, як заўсёды, выступілі адзіным фронтам», адзначыў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.

Як лічыць старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Людміла НІЖЭВІЧ, фінансавая сфера найбольш схільная да глабальных рынкавых адносін і лічбавізацыі. Таму заканатворцы мусяць апярэджваць сусветныя працэсы недзе на крок.

У прыватнасці, у дэпутацкага корпуса наперадзе работа над удасканаленнем банкаўскага заканадаўства. Сярод іншага гэтаму скліканню давядзецца зноў скарэктаваць Падатковы кодэкс з улікам практыкі, паведаміла Людміла Ніжэвіч.

Старшыня Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Мікалай ВАСІЛЬКОЎ звярнуў увагу калег на тое, што ў парламенце створана заканадаўчая база па рацыянальным карыстанні прыроднымі рэсурсамі і ахове навакольнага асяроддзя, радыяцыйнай бяспецы, але гэтая база не з'яўляецца нязменнай. У прыватнасці, у найбліжэйшы час дэпутатам належыць разглядзець змяненні ў Законе аб гідраметэаралагічнай дзейнасці, Кодэксе аб нетрах.

На гэты тэрмін старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Людміла МАКАРЫНА-КІБАК бачыць прыярытэтнай работу над пытаннямі фарміравання здаровага спосабу жыцця, удасканаленне механізма дыспансерызацыі насельніцтва, развіццё стацыянарзамяшчальных тэхналогій, завяршэнне паэтапнага пераводу работы ўчастковай службы на прынцып урача агульнай практыкі, укараненне сістэмы ацэнкі якасці медыцынскай дапамогі, пабудову сістэмы электроннай аховы здароўя, умацаванне айчыннай фармацэўтычнай вытворчасці і забеспячэнне даступнасці лекавых сродкаў.

З натхнёнай прамовай звярнуўся да ніжняй палаты парламента дэпутат ад Магілёўскай-Ленінскай выбарчай акругі № 84 Ігар МАРЗАЛЮК з нагоды вылучэння на пасаду старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.

Старшынёй Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце абраны дэпутат Слонімскай акругі № 58 Валянцін СЕМЯНЯКА. Дэпутат Аляксандр СОНГІН адзначыў, што калега — шматгранная і творчая асоба — таксама і член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Працоўная дзейнасць Валянціна Семянякі звязана з Зэльвенскім раёнам Гродзенскай вобласці. Ён прайшоў шлях ад настаўніка да старшыні раённага Савета дэпутатаў. «Працуючы дырэктарам Князеўскай сярэдняй школы, ён адзін з першых у краіне ўкараніў сістэму знешняй дыверсіфікацыі навучання ў сельскай мясцовасці, профільныя групы для вучняў старэйшых класаў. На пасадзе начальніка аддзела адукацыі актыўна займаўся навуковай дзейнасцю. Пад кіраўніцтвам Валянціна Міхайлавіча аддзел выйшаў на вядучыя пазіцыі ў вобласці і краіне», — канстатаваў Аляксандр Сонгін.

Сярод галоўных задач для сябе на пасадзе Валянцін Семяняка адзначыў павышэнне ролі органаў мясцовага кіравання ў сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёнаў, карэкціроўку Закона аб дзяржаўнай службе. І асабліва адказны этап дзейнасці — удзел у сумеснай рабоце па ўдасканальванні Канстытуцыі. Дэпутат упэўнены, што заканатворчая работа ў камісіі павінна будавацца ў цесным кантакце з усімі галінамі ўлады, у тым ліку Адміністрацыяй Прэзідэнта, Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў. «Выкажу ўпэўненасць, што выніковасць нашай камісіі будзе залежаць ад канструктыўных прапаноў іншых пастаянных камісій і кожнага з вас», — звярнуўся да парламентарыяў Валянцін Семяняка.

У інтэрв'ю «МС» ён расказаў, што ў першую чаргу камісія зоймецца Законам аб дзяржаўных геральдычных сімвалах. «Калі казаць пра больш далёкую перспектыву, то для мяне вельмі цікавы наяўны вопыт рэгіянальнай дзейнасці. Неабходна яго вывучыць, абагуліць і разабрацца, якія ёсць станоўчыя і адмоўныя моманты, каб іх падкарэктаваць, а лепшае ўнесці ў закон», — паведаміў дэпутат.

Аднойчы Канстытуцыя, на думку старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, павінна павялічыць паўнамоцтвы рэгіянальных органаў па размеркаванні бюджэту, распараджэнню маёмасцю. «Разумееце, сітуацыя складваецца такім чынам, што адказнасць мясцовых органаў кіравання перад вышэйшымі органамі і грамадзянамі вялікая, а паўнамоцтвы часам абмежаваныя. І яны не могуць у поўнай ступені рэалізаваць тыя запыты, якія да іх прад'яўляюцца. Таму наша задача як парламентарыяў — якраз стварыць ім такія ўмовы, каб яны маглі сваю адказнасць рэалізаваць у паўнамоцтвах», — падзяліўся думкамі Валянцін Семяняка.

Старшынёй камісіі па эканамічнай палітыцы абраны дэпутат ад Брэсцкай-Заходняй акругі № 1 Леанід БРЫЧ. Прынцып работы дэпутата — з людзьмі і для людзей.

Гэта ўжо другі тэрмін Леаніда Брыча на пасадзе дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Выхадзец з бізнесу, ён добра разумее праблемы і чаканні гэтай часткі грамадства. На думку парламентарыя, мэтамі і прыярытэтамі дзейнасці Пастаяннай камісіі на найбліжэйшую перспектыву павінны стаць паляпшэнне ўмоў бізнесу, узмацненне гарантый правоў прыватнай уласнасці, павышэнне эканамічнай эфектыўнасці дзяржаўных арганізацый, стымуляванне інвестыцыйнай актыўнасці, забеспячэнне патрэб эканомікі ў фінансавых рэсурсах і павышэнне іх даступнасці ў тым ліку для суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

**Варвара МАРОЗАВА, Марыя ДАДАЛКА.**

ПАТРЭБНЫ АБ'ЕКТ

# 208 метраў над Заходнім Бугам

**Такая прыблізная працягласць новага пагранічнага моста пад Брэстам, пачатак будаўніцтва якога запланаваны налета.**

Па ратыфікацыі пагаднення паміж урадамі Беларусі і Польшчы на апошняй сесіі Савета Рэспублікі шостага склікання дакладваў **міністр транспарту і камунікацый Аляксей АЎРАМЕНКА.** Ён паведаміў, што ўзвядзенне новага аўтадарожнага пагранічнага маставога аб'екта цераз раку Заходні Буг на пагранічным аўтадарожным пераходзе Дамачава — Славатычы на беларуска-польскай дзяржаўнай граніцы будзе ажыццяўляцца на парытэтных умовах. Пагадненне прадугледжвае парадак перадачы неабходных будаўнічых матэрыялаў, падрыхтоўку пад'язных шляхоў да аб'екта, фінансаванне выдаткаў беларускім і польскім бакамі, правядзенне шэрагу арганізацыйных мерапрыемстваў і неабходных працэдур, якія будуць папярэднічаць пачатку вялікай будоўлі міжнароднага характару. Гэта ў тым ліку стварэнне змешанай беларуска-польскай камісіі па пытаннях рэалізацыі праекта, падрыхтоўка дакументацыі, экалагічная экспертыза і г. д.

Міністр адзначыў, што існуючы пераход цераз Заходні Буг пэўны час знаходзіўся ў аварыйным стане і нават пасля рамонту мае некаторыя дэфекты. З гэтай прычыны ўведзены абмежаванні на праезд аўтамабіляў і аўтобусаў агульнай масай больш за 7,5 тоны, у выніку мост не працуе на поўную магутнасць. Новы мост дазволіць зняць гэтыя абмежаванні і наладзіць бяспечны кругласутачны рух цераз граніцу транспарту любой грузападымальнасці і людзей, а таксама істотна знізіць нагрузку на пераходы «Варшаўскі мост» і «Казловічы».

Па папярэдніх падліках, будаўніцтва новага моста зойме 1 год і 10 месяцаў, а поўная рэалізацыя праекта расцягнецца амаль на чатыры гады. Прыблізны кошт — каля 28 мільёнаў рублёў.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# КРАІНА ПАСПЯХОВАГА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Падобны фармат работы, з аднаго боку, дазволіў разглядаць на пасяджэннях пытанні, якія хвалююць бізнес-супольнасць, прымаючы па іх большасцю галасоў рашэнне, якое задавальняе прадпрымальнікаў. З другога боку — павысіць узровень адказнасці мясцовых улад за прыняцце і выкананне рашэнняў, што ўплываюць на ўмовы ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці ў рэгіёнах.

Практыка работы рэгіянальных саветаў паказала, што ў большасці выпадкаў пытанні, якія выносіліся на пасяджэнні, з'яўляліся праблемнымі для бізнесу з прычыны няведання заканадаўства і былі вырашаны на ўзроўні тлумачэнняў.

**У 2016—2018 гады і за дзевяць месяцаў 2019 года са сродкаў мясцовых бюджэтаў дзяржаўная фінансавая падтрымка аказана 308 суб'ектам малога прадпрымальніцтва на 13,1 мільёна рублёў.**

Так, профільнымі службамі Мінскага аблвыканкама растлумачаны парадак дзеянняў па наступных агучаных на пасяджэннях саветаў пытаннях: парадак афармлення аб'екта нерухомасці, зямельнага ўчастка да яго са змяненнем мэтавага прызначэння, набытых і (або) атрыманых для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці; працэдура выдзялення (павелічэння) зямельнага ўчастка пад кацельню для забеспячэння будынка ацяпленнем; парадак размяшчэння дрэваапрацоўчай вытворчасці ў межах зямельнага ўчастка з улікам санітарных, прыродаахоўных і супрацьпажарных нормаў і правіл у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам; уцягванне ў гаспадарчы абарот аб'ектаў дзяржаўнай нерухомасці; парадак правядзення працэдуры грамадскага абмеркавання па ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе планаванай вытворчасці.

Па ацэнцы бізнес-суполкі, саветы створаны і функцыянуюць як пляцоўкі для эфектыўнага вырашэння праблем бізнесу без звароту ва ўрад і да Прэзідэнта.

## МОВАЙ ЛІЧБАЎ

У Беларусі распрацавана дзяржаўная праграма падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва на 2016—2020 гады. Рэалізацыя дакумента накіравана на паляпшэнне дзелавога асяроддзя, садзейнічанне развіццю суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, удасканаленне інфраструктуры падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, фарміраванне пазітыўнага стаўлення грамадзян да прадпрымальніцкай ініцыятывы.

Пад кожную задачу распрацаваны і ажыццяўляюцца адпаведныя мерапрыемствы.

Сёлета Дзяржаўная праграма дапоўнена комплексам мер па рэалізацыі першага этапу стратэгіі развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва «Беларусь — краіна паспяховага прадпрымальніцтва» на перыяд да 2030 года.

Мерапрыемствы комплексу мер больш чым на 60 працэнтаў складаюцца з прапаноў бізнес-супольнасці, прадугледжваюць далейшае паступальнае зніжэнне адміністрацыйнай і фіскальнай нагрузкі на прадпрымальнікаў, фарміраванне канкурэнтнага асяроддзя і забеспячэнне роўных умоў гаспадарання для суб'ектаў розных формаў уласнасці, удасканаленне галіновай і тэрытарыяльнай структуры бізнесу, стварэнне ў малых і сярэдніх арганізацыях новых рабочых месцаў. Першыя вынікі рэалізацыі гэтых мер будуць падведзены ў першым квартале 2020 года.

Вось толькі некаторыя звесткі, што характарызуюць фінансавую падтрымку малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы.

У 2016—2018 гады і за дзевяць месяцаў 2019 года са сродкаў мясцовых бюджэтаў дзяржаўная фінансавая падтрымка аказана 308 суб'ектам малога прадпрымальніцтва на 13,1 мільёна рублёў.

Ільготныя крэдыты дадзены 80 суб'ектам малога прадпрымальніцтва на суму 10,2 мільёна рублёў. Субсідыі для пакрыцця часткі працэнтаў за карыстанне банкаўскімі крэдытамі і часткі расходаў на выплату лізінгавых плацяжоў выдзелены 156 арганізацыям на суму 2,6 мільёна рублёў, субсідыі для пакрыцця часткі выдаткаў, звязаных з удзелам у выставачна-кірмашовых мерапрыемствах альбо з іх арганізацыяй, — 72 суб'ектам малога прадпрымальніцтва на суму 300 тысяч рублёў.

Беларускім фондам фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў прафінансавана 120 праектаў суб'ектаў малога прадпрымальніцтва. Дзеля пашырэння доступу гэтай катэгорыі суб'ектаў гаспадарання да крэдытных рэсурсаў з пачатку рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы паэтапна зніжалася працэнтная стаўка (з 18 да 6,5 працэнта гадавых) пры даванні дзяржаўнай фінансавай падтрымкі на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў, накіраваных на вытворчасць экспартаарыентаванай і (або) імпартазамяшчальнай прадукцыі (тавараў, работ, паслуг) і стварэнне новых рабочых месцаў.

Агульны аб'ём аказанай фондам фінансавай падтрымкі склаў 11,4 мільёна рублёў, у тым ліку з рэспубліканскага бюджэту — 8,5 мільёна рублёў, за кошт уласных сродкаў фонду — 2,9 мільёна рублёў. Фінансавая падтрымка аказвалася шляхам выдачы суб'ектам малога прадпрымальніцтва пазык і маёмасці на ўмовах фінансавай арэнды (лізінгу).

У рамках рэалізацыі новага для нашай краіны гарантыйнага механізма фондам сёлета дадзена 11 паручыцельстваў на суму 178,9 тысячы рублёў, якія забяспечваюць крэдыты банкаў-партнёраў на суму 381,6 тысячы рублёў.

Банк развіцця Рэспублікі Беларусь прафінансаваў 2884 інвестыцыйныя праекты, агульны аб'ём дэпазітаў, размешчаных у банках-партнёрах, склаў 427,7 мільёна рублёў. Банк развіцця дыферэнцыраваў прадуктовую лінейку і ўмовы аказання фінансавай падтрымкі ў адпаведнасці з прыярытэтнымі кірункамі развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

Для садзейнічання суб'ектам малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў арганізацыі і ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці ў краіне дзейнічае сетка суб'ектаў інфраструктуры падтрымкі прадпрымальніцтва, якая на 1 снежня 2019 года складалася з 109 цэнтраў падтрымкі прадпрымальніцтва і 25 інкубатараў малога прадпрымальніцтва.

За перыяд рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы ў якасці цэнтра падтрымкі прадпрымальніцтва зарэгістравана 51 юрыдычная асоба, у якасці інкубатара малога прадпрымальніцтва — 12 юрыдычных асоб. Для садзейнічання ў рэалізацыі задач па падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва аказана фінансавая падтрымка 43 суб'ектам інфраструктуры на агульную суму 2,8 мільёна рублёў.



Новапалачанка Юлія БАРЫСАВА стварае маляўнічыя ружавыя кветкі з ізалону.

Фота БелТА.

## ВУП У ПЛЮСЕ

Паводле афіцыйнай статыстыкі, да пачатку 2019 года доля малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў валавым унутраным прадукце склала 24,6 працэнта. У адносных адзінках значэнне гэтага паказчыка захавалася на ўзроўні папярэдняга года.

Аднак гэта не азначае, што сектар не развіваецца. У цэлым па краіне ВУП летась прырос амаль на пяць мільярдаў долараў ЗША. Такім чынам, у абсалютных велічынях значэнне ВУП, выпрацаванага суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, таксама прапарцыйна павялічылася.

Пра павышэнне эфектыўнасці дзейнасці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва сведчаць і іншыя даныя. Напрыклад, суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва забяспечана больш за палову экспарту тавараў краіны (50,5 працэнта). Валавы экспарт тавараў павялічыўся на 25 працэнтаў і склаў 17 мільярдаў долараў ЗША.

Экспарт паслуг суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва летась узрос на чвэрць і перавысіў тры мільярды долараў ЗША. Удзельная вага малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў агульным аб'ёме экспарту паслуг непасрэдна наблізілася да адзнакі ў 40 працэнтаў (39,8 працэнта).

Ва ўмовах мараторыя на павышэнне падатковых ставак і ўвядзенне новых падаткаў паступленне падаткаў і збораў ад суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў бюджэт павялічылася на 20 працэнтаў.

Узрос попыт з боку суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва на прыцягненне знешніх фінансавых рэсурсаў. Партфель інвестыцыйных камерцыйных крэдытаў для гэтай катэгорыі пазычальнікаў склаў больш за 26,5 мільярда рублёў (амаль у паўтара раза больш, чым летась).

Вынікі дзевяці месяцаў бягучага года паказваюць захаванне станоўчай дынамікі ў прыросце суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, і, адпаведна, чакаецца павелічэнне ўнёску гэтага сектара ў асноўныя эканамічныя паказчыкі.

**Варвара МАРОЗАВА.**

**Найбольшая дзелавая актыўнасць назіраецца ў Мінску і Мінскай вобласці. Адпаведна, прадпрымальнікі сталіцы і Міншчыны робяць больш важкі ўнёсак у развіццё рэгіянальных эканомік. Так, удзельная вага суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў валавым рэгіянальным прадукце Мінска складае больш за 40 працэнтаў, у Мінскай вобласці — каля 32 працэнтаў.**

**У іншых рэгіёнах значэнне гэтага паказчыка вагаецца ў дыяпазоне ад 18,6 да 24,7 працэнта. І толькі ў Гомельскай вобласці, на тэрыторыі якой дзейнічаюць прамысловыя гіганты — Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, Беларускі металургічны завод — кіруючая кампанія холдынга «Беларускі металургічны камбінат», ВА «Беларуснафта», «Гомсельмаш», — доля малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў ВРП вобласці складае 16 працэнтаў.**

Тэлесеткі

# ЮБІЛЕЙ З МУЗЫКАЙ

**17 снежня краіна адзначыць 95-годдзе беларускага кінематографа. Сацыякультурны канал увесь год рыхтаваўся да свята, прадстаўляючы тэматычныя праекты і не абмінаючы ўвагай знакавых дзеячаў нацыянальнага кіно і найлепшыя карціны айчыннай вытворчасці.**

У новым вяшчальным сезоне «Беларусь 3» паказаў ужо шмат любімых тэлегледачамі беларускіх фільмаў, многія з якіх па праве можна надзяліць «залатым» статусам, а праграма «Час кіно»назнаёміла прыхільнікаў дакументалістыкі з сучаснымі беларускімі аўтарамі і іх работамі. 20 снежня госцем праекта стане Уладзімір Бокун, а адразу пасля інтэрв'ю ў эфір выйдзе яго дакументальная стужка «Жанін».

У пачатку снежня сацыякультурны тэлеканал запусціў новы штодзённы цыкл праграм ад рэжысёра Белтэлерадыёкампаніі Сяргея Кацьера «Кіно маёй краіны», у якім іншы вядомы рэжысёр і сцэнарыст Уладзімір Арлоў дзеліцца сваім прафесійным поглядам на гісторыю беларускага кіно. Здымкі праекта вяліся на працягу года на шматлікіх лакацыях, якія маюць дачыненне да кіно, а асаблівы антураж гэтым аповедам надаюць архіўныя відзаматэрыялы з фондаў Белтэлерадыёкампаніі і нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм».

З 16 да 20 снежня «Беларусь 3» прапануе гледачам падборку выпускаў праграм «Майстры і куміры» з удзелам кінаакцёраў Уладзіміра Мішчанчука, Арнольда Памазана, Зінаіды Зубковай і Андрэя Душачкіна. Вядучая праекта «Тэатр у дэталях» Наталля Бібікава раскажа пра спектаклі сталічнага Тэатра-студыі кінаакцёра, сярод якіх «Пігмаліён», «Безыменная зорка» і «Механічны чалавек».

У Дзень беларускага кіно ў эфіры будзе прадстаўлены тэматычны паказ фільмаў айчыннай вытворчасці — першая частка міні-серыяла «Снайпер. Зброя помсты» (08.30 і 18.20), «Анастасія Слуцкая» (09.20 і 16.15) і «Кур'еры страху» з цыкла «Дзяржаўная граніца» (12.45 і 21.05). У дзённым эфіры на «Беларусь 3» выйдзе новы выпуск праграмы «Камертон», героем якога стане рэжысёр Вячаслаў Нікіфараў, а вечарам гледачоў чакае канцэртная праграма «Яўген Глебаў. Музыка з кінафільмаў» з любімымі і знаёмымі кожнаму кампазіцыямі.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 83

У сённяшняй задачы *(гл. дыяграму)* ёсць блізня: белага ферзя трэба переставіць на h1.



**Белыя:** Кра3, Фf1, Лh3 (3).
**Чорныя:** Кра1, Фb1, пп. а2, е5 (4).

Мат за 2 ходы.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

Сёлета адзначыў 70-гадовы юбілей вядомы беларускі шахматыст Вячаслаў Дыдышка. Брэсцкі гісторык шахмат Віктар Жук прысвяціў гэтай падзеі сваё новае выданне «Талент з Палесся», дзе, у прыватнасці, піша: «Вячаслаў Іосіфавіч Дыдышка нарадзіўся ў вёсцы Свяціца Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў шматдзетнай сям'і. Да старэйшых братоў прыходзілі сябры пагуляць у шахматы. Славік уважліва сачыў за гульнёй, засвоіў правілы і хутка сам пачаў перамагаць за дошкай... Пасля шостага класа жыў у інтэрнаце ў Мінску. Вучоба ў школе адзначана залатым медалём. Затым Вячаслаў атрымаў дыплом з адзнакай аб заканчэнні матэматычнага факультэта БДУ... З цягам часу стаў міжнародным гросмайстрам. 11-разовы чэмпіён Беларусі, 6-разовы сярэбраны прызёр і 4-разовы бронзавы. Атрымаў медаль 31-й Сусветнай шахматнай алімпіяды (Масква, 1994 год) за першае месца на сваёй дошцы». У 2010 годзе на чэмпіянаце свету сярод сеньёраў (224 удзельнікі) падзяліў 1-3 месцы і заваяваў бронзавы медаль. Заслужаны трэнер Беларусі, аўтар кнігі «Логіка сучасных шахмат» (1984).

У дзвюх наступных партыях беларускі майстар перамог будучых легендарных чэмпіёнаў.

Анатоль Карпаў — Вячаслаў Дыдышка. Масква, 1966. 1. e4 d5 2. ed Kf6 3. d4 K:d5 4. c4 Kb6 5. Kc3 e5 6. Kf3 ed 7. Ф:d4 Kc6 8. Ф:d8+ K:d8 9. Kd4 Kc6 10. Kc2 g6 11. b3 Cg7 12. Cb2 Cd7 13. 0-0-0 0-0-0 14. Kd5 C:b2+ 15. Kp:b2 K:d5 16. cd Ke5 17. Cc4 Kg4 18. f3 Kf2 19. d6 K:d1+ 20. Л:d1 Ce6, 0:1.

Вячаслаў Дыдышка — Гары Каспараў. Мінск, 1978. 1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. Kc3 Cg7 4. e4 d6 5. Ce2 0-0 6. Cg5 c5 7. d5 h6 8. Ce3 e6 9. Фd2 ed 10. ed Kph7 11. h3 Ле8 12. Kf3 Cf5 13. Cd3 Фd7 14. Фc2 Ka6 15. C:f5 Ф:f5 16. Ф:f5 gf 17. 0-0-0 Ke4 18. K:e4 fe 19. Kh4 Ле5 20. g4 Kb4 21. Kf5 Л:f5 22. gf Kd3+ 23. Kpc2 b5 24. cb K:b2 25. Лb1 Kc4 26. a4 Ле8 27. Лhd1 Cf6 28. Kpb3 Ka5+ 29. Kpc2 Kc4 30. Kpb3 Ka5+ 31. Kpc2 Kc4 32. Лb3 Ле7 33. Лc3 Ka5 34. Cf4 Ce5 35. f6 Ле8 36. C:e5 Л:e5 37. Лg3 Лg5 38. Л:g5 hg 39. Ле1 Kpg6 40. Л:e4 Kp:f6 41. Kpc3 Kb7 42. a5, 1:0.

* * *

Аляксей Фёдараў выйграў турнір у румынскім горадзе Альба-Юлія (44 удзельнікі). У некалькіх турнірах беларускія шахматысты занялі чацвёртыя месцы: Сяргей Азараў — у Тэгерзеі (Германія, 505 удзельнікаў), Мікіта Маёраў — у Фігуэйры (Партугалія), Уладзімір Палей — у Стакгольме, а Андрэй Кавалёў — ва Упсале (Швецыя) і ў Берліне 145 удзельнікаў. У спаборніцтвах на Корсіцы (Францыя) Сяргей Азараў быў пяты ў папярэднім турніры (150 удзельнікаў), а потым у паядынках наймацнейшых дайшоў да фіналу і ў выніку заняў другое месца. Ён жа фінішаваў другі ў амерыканскім Сент-Луісе. У Маскве на Кубку М. Бацвінніка Максім Царук заняў першае месца сярод юнакоў, а Ксенія Зелянцова — трэцяе сярод дзяўчат. У Рызе (66 удзельнікаў) Вольга Бадэлька, Ягор Філіпец і Ягор Сіліч занялі адпаведна 5-е, 9-е і 17-е месцы. На чэмпіянаце свету сярод сеньёраў (старэйшых за 65 гадоў) у Бухарэсце Яўген Мачалаў фінішаваў на 13-м месцы са 192. Прызавую тройку рэспубліканскай спартакіяды спартшкол склалі зборная Магілёва і Бабруйска, Мінская СДзЮШАР і каманда Оршы.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Ke1! ~ 2. Kc2 і 3. K:e3x, 1...Ch2 2. Фh3+, 1...feФ 2. Cd7+. Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Уладзімір Ізотаў, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук, Сяргей Васілевіч.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





Сядзі і глядзі

# Ведаць, разважаць... і перамагчы

Сумесны праект Белтэлерадыёкампаніі і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь — шоу «Я ведаю!» — зноў шукае самых разумных, ініцыятыўных і кемлівых вучняў 5-11 класаў з усёй краіны.

Цяпер ідуць здымкі ўжо трэцяга сезона праграмы. Удзельнікі маюць розны ўзровень падрыхтоўкі і, як зазначае вядучы, іх нават не параўнаеш, бо здараецца так, што, маючы глыбокія веды, школьнікі губляюцца перад камерай, а часу звыкнуцца з атмасферай няшмат. Цікаўлюся ў аднаго з вучняў, які збіраюцца заняць месцы за прыйшоў гуляць, які настрой перад спаборніцтвам?

— Я настроены аптымістычна, бо рыхтаваўся. Свае веды, плюс чытаў і глядзеў выпускі мінулых сезонаў, і за 8, і за 10-11 класы, каб арыентавацца ў сутнасці пытанняў, — кажа васьмікласнік Антон Ленартовіч з Ашмян. — Безумоўна, усе, хто сёння прыйшоў гуляць, жадаюць перамогі, і я не выключэнне. Паглядзім, як усё складзецца.

У новым сезоне змяніліся правілы гульні: стаць яе ўдзельнікам можна толькі адзін раз за чатыры гады. Дарэчы, змянілася і лакацыя здымак, якія ідуць цяпер у адным з павільёнаў «Беларусьфільма». А вось вядучым праекта па-ранейшаму засталіся Георгій Калдун, які агучвае школьнікам пытанні і шукае адказы на іх, і Дзмітрый Новік, які ў настаўніцкай падтрымлівае дзяцей разам з іх настаўнікамі. Новы сезон традыцыйна будзе выходзіць на тэлеканале «Беларусь 1» па выхадных адразу пасля зімовых вакацый — з 11 студзеня.


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Бліц-апытанка з вядучым «Я ведаю!» Дзмітрыем НОВІКАМ:**

**1.** ***Кім хацеў стаць Дзмітрый Новік у школе?***

— Мае інтарэсы адносна будучай прафесіі мяняліся некалькі разоў. Класа да чацвёртага я бачыў сябе мастаком-мультыплікатарам, потым хацеў стаць паэтам. Затым узнікла думка пра археалогію. А ў старэйшых класах я рыхтаваўся да сваёй будучай спецыяльнасці, разлічваючы «пайсці на юрыста». Быў таксама перыяд, калі вельмі імкнуўся паступіць на акцёрскае майстэрства, аднак не склалася, і я стаў юрыстам.

**2.** ***Ці часта вас выклікалі ў настаўніцкую?***

— Для мяне прафесія настаўніка святая, і, думаю, гэта ніколі не зменіцца. Я вучыўся ў чатырох школах і меў шмат настаўнікаў. Але паколькі быў харашыстам і не сваволіў, у настаўніцкую заходзіў, толькі каб узяць журнал. Як сёння памятаю шэраг дзверы, адчыняючы якія, бачыў паліцы з кнігамі і журналамі. Таму цяпер, калі настаўнікі прыходзяць да мяне ў настаўніцкую, гэта нібы камбэк у школьныя гады. У нас вядзецца сяброўская размова, але я кожны раз хвалююся, бо з настаўнікамі ніколі не ведаеш, чаго чакаць.

**3.** ***Вашы галоўныя ўрокі жыцця са школьных часоў?***

— Галоўнае правіла, якое я вынес для сябе, — не ўсё, чаму вас вучаць у школе, рэальна спатрэбіцца ў дарослым жыцці. Важна, каб усё было ў гармоніі: вучоба, спорт, асабістае жыццё. Каб пасля выпускных экзаменаў можна быць гатовым выстаяць з тымі ведамі, якія заклалі ў цябе за школьныя гады.

**4.** ***Калі б вы аказаліся на месцы ўдзельніка «Я ведаю!», на колькі пытанняў далі б правільныя адказы?***

— Думаю, на здымачнай пляцоўцы мне было б камфортна, але не на ўсе пытанні я змог бы адказаць, бо яны сапраўды складаныя. Васьмікласнікі не заўсёды помняць, што праходзілі ў шостым класе, і я таксама не ўсё змагу згадаць. І разумею: калі б атрымаў запрашэнне на тэлевізійны праект, кшталту нашага, ведаючы, што за мной назіраюць бацькі, выкладчыкі, то вельмі б хваляваўся і ўвогуле нічога б не атрымалася.

**5.** ***Што застаецца за кадрам інтэлектуальнага шоу?***

— У нас былі слёзы, істэрыкі, некаторыя страчвалі прытомнасць. А самае цікавае (я ж сяджу ў настаўніцкай), што настаўнікі ў кадры зусім не тыя людзі, якімі ты бачыш іх па-за здымачнай пляцоўкай. І гэта зразумела, бо на іх ляжыць адказнасць за вучня, школу і ўвогуле за сістэму адукацыі нашай краіны.

**Алена ДРАПКО.**


**Сяброў у новым годзе не мяняюць!**

— Наша кавярня — гэта ўнікальны аб'ект, якіх у горадзе адзінкі. Вельмі важна адкрыць у такім месцы падобнае кафэ, дзе можна паласавацца свежай выпечкай, адразу сышоўшы з цягніка. Наогул мы разлічваем на наведванне дзяцей з бацькамі, у памяшканне можна будзе заехаць з дзіцячай каляскай, — расказвае Аляксандр.

Планавалі, што адразу пасля ўзгаднення праекта пачнуцца работы. І сапраўды, пляцоўка пад будучае кафэ падрыхтавана, з'явіліся агароджа, вагончык для будаўнікоў. Але справа нечакана спынілася, і аб'ект на некалькі месяцаў быў замарожаны.

### Будаўніцтва пад пагрозай?

Жыхары шматпавярховіка, каля якога запланавана будаўніцтва, пачалі выступаць супраць будаўніцтва кафэ. Гэта гісторыя сёлета атрымала рэзананс на інтэрнэт-парталах, жыхары заявілі, што збіраюць подпісы супраць будаўніцтва ў іх двары пунктаў грамадскага харчавання. Маўляў, тут будзе шумна, а двор застанецца без дзіцячай пляцоўкі. Аляксандр Бычкоўскі асабіста сустрэўся з людзьмі, каб растлумачыць ім, што ён будуе не забягалаўку, а ўтульнае сямейнае кафэ, без ніякага алкаголю, а толькі з кандытарскімі вырабамі.

Сапраўды, кафэ наўрад ці можна параўнаць з забягалаўкай. Толькі на будаўнічыя работы будзе затрачана 1,1 мільёна рублёў, яшчэ 300 тысяч — на абсталяванне. Але і ў гэтыя сродкі наўрад ці можна ўкласціся, кажа гаспадар.

Як паведаміў Аляксандр Леанідавіч, значная частка работы зроблена. Ужо праведзены камунікацыі, працягнута лінія электраперадачы. Літаральна днямі пачнецца ўзвядзенне самога будынка, падрадчыкам з'яўляецца прыватная будаўнічая арганізацыя. Згодна з планам, ужо напрыканцы лета кафэ прыме сваіх наведвальнікаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

### У тэму

**Яўген АРАДЗЬ, начальнік аддзела спорту і турызму Гродзенскага гарвыканкама:**

— У будучым годзе ў Гродне плануецца адкрыць 20 новых кафэ і рэстаранаў. Будзе будавацца сем хостэлаў. Актыўнасці бізнесу спрыяе бязвізавая зона, якая нядаўна значна пашырылася і аб'яднала Гродзенскую і Брэсцкую вобласці. Мы будзем працягваць развіваць, у першую чаргу, гасцінічны бізнес і грамадскае харчаванне. Гораду патрэбны ўнікальныя пункты, са сваім каларытам і асартыментам.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении аукциона

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 411/С-13813 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 191,0 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Дзержинского, 58.
Лот 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001167 (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (обслуживания здания магазина)), площадью 0,1022 га, находящемся по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Дзержинского, 58. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0,0134 га

Начальная цена продажи – 19 776 руб. (девятнадцать тысяч семьсот семьдесят шесть рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 1977 руб. (одна тысяча девятьсот семьдесят семь рублей)

ЛОТ 2:
– капитальное строение, инв. № 411/С-15726 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака 2 25 01, наименование – квасильно-засолочный цех), площадью 80,4 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Ленина, 21А;
– сооружение, инв. № 411/С-15762 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства 3 10 00, наименование – наружная сеть канализации), протяженностью 14,4 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Ленина, 21А.
Лот 2 расположен на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001330 (назначение – земельный участок для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции 1 16 06 (обслуживания здания квасильно-засолочного цеха)), площадью 0,0517 га, находящемся по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Ленина, 21А

Начальная цена продажи – 6062 руб. (шесть тысяч шестьдесят два рубля) с учетом НДС. Сумма задатка – 606 руб. (шестьсот шесть рублей)

ЛОТ № 3:
– капитальное строение, инвентарный номер 411/С – 14795 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака 2 25 01, наименование – колбасный цех), площадью – 407,5 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32;
– капитальное строение, инвентарный номер 411/С – 14796 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ 2 29 08, наименование – склад), площадью – 70,8 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32/1;
– капитальное строение, инвентарный номер 411/С – 14797 (назначение – здание специализированное иного назначения 2 29 00, наименование – насосная), площадью – 3,9 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32/2;
– капитальное строение, инвентарный номер 411/С – 14798 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ 2 29 08, наименование – склад), площадью – 11,8 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32/3.
Лот 3 расположен на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001155 (назначение – земельный участок для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции 1 16 06 (обслуживания зданий насосной, колбасного цеха и двух складов)), площадью 0,1803 га, находящемся по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов, площадь 0,1803 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0,0432 га

Начальная цена продажи – 20 424 (двадцать тысяч четыреста двадцать четыре рубля) с учетом НДС. Сумма задатка – 2 042 руб. (две тысячи сорок два рубля)

**Продавец** – Берестовицкий филиал Гродненского областного потребительского общества, 231778, г. п. Берестовица, ул. Советская, 2, тел. 8-01511-750-90

**Организатор торгов** – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-71

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44-BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 13 января 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3–209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 9 января 2020 г. до 15.00**

*Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# ДЗЕЛАВАЯ АКТЫЎНАСЦЬ

## Як яе павысіць у сельскім раёне, раіліся дэпутаты райсавета

**Сесія Маларыцкага раённага Савета разгледзела пытанне аб развіцці прадпрымальніцтва, яго ролі ў фарміраванні даходнай часткі бюджэту, вырашэнні пытанняў занятасці насельніцтва. Падчас сесіі дэпутаты прааналізавалі стан рэчаў у малым і сярэднім прадпрымальніцтве, меры, якія прымаюцца для стымулявання дзелавой актыўнасці грамадзян, раіліся, як актывізаваць работу.**

Адзначалася, што на тэрыторыі раёна дзейнічаюць 129 мікра-, малых і сярэдніх арганізацый, у тым ліку 29 фермерскіх гаспадарак, зарэгістравана больш за 350 індывідуальных прадпрымальнікаў. Ужо сёлета пачалі работу 11 новых прадпрыемстваў. Усяго ў сферы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва раёна занятыя каля 2,5 тысячы чалавек.

Штогод растуць паступленні ў бюджэт ад гэтага сектара эканомікі. Калі скажам, у 2017-м іх удзельная вага складала 13,9 працэнта, у 2018 годзе гэты паказчык дасягнуў — 14,8, то за першае паўгоддзе 2019-га з названага сектара ў бюджэт паступіла 19,1 працэнта яго даходнай часткі. Варта адзначыць таксама, што прыватныя прадпрыемствы Маларытчыны пастаўляюць прадукцыю ў 14 краін свету.

**Старшыня раённага Савета Алег ЯКУБЧЫК** адзначыў асаблівую важнасць інвестпраектаў, якія ажыццяўляе прыватны бізнес. Напрыклад, таварыства з абмежаванай адказнасцю «Белхмельагра» працуе над рэалізацыяй інвестпраекта па перапрацоўцы і грануляванні хмелю. Работа разлічана на чатыры гады — 2016—2020. Пасля яе завяршэння плануецца павялічыць якасць хмелю за кошт скарачэння тэрміну перапрацоўкі, нарасціць аб'ёмы перапрацоўкі прадукцыі і адпаведна павялічыць выручку амаль на траціну.



Ігар Шумілін.

Яшчэ адно таварыства з абмежаванай адказнасцю «Палетэн Люкс» будуе навес з устаноўкай сушыльнай камеры для драўніны. Пасля рэалізацыі інвестпраекта якасць яе перапрацоўкі вырасце і з'явяцца новыя магчымасці для рэалізацыі. Нарыхтоўкай і перапрацоўкай драўніны, дарэчы, тут займаецца шэраг прыватных структур, а гэта адзін з важных складнікаў экспартных паставак з раёна.

Апошнім часам на Маларытчыне загаварылі аб прадпрыемстве «РостАграТрэйд». Гэтая прыватная фірма займаецца вырошчваннем клубніц, малін, буякоў і іншых культур. Цяпер прадпрыемства рэалізуе буйны інвестпраект, які дазволіць вывесці вырошчванне і нарыхтоўку ягад на новы ўзровень. Рэалізоўваць прадукцыю плануюць выключна на экспарт у краіны СНД і ЕС. «РостАграТрэйд» мае намер пабудаваць цэх хуткай замарозкі агароднiны і ягад для пастаўкі на экспарт. І замарожваць будуць не толькі сваю прадукцыю, але і набытую ў іншых вытворцаў, бо магутнасці цэха будуць нашмат перавышаць аб'ёмы ўласнай вытворчасці.

— Гэта вельмі выгадны для ўсіх праект, — падкрэсліў старшыня раённага Савета Алег Якубчык. — Кожны год у фермераў здараюцца тыя ці іншыя праблемы з рэалізацыяй прадукцыі. Вытворцы не жадаюць прадаваць вырашчанае за капейкі, а вывозіць далёка за межы вобласці альбо нават краіны ў іх не хапае сродкаў і тэхнічнага патэнцыялу. Цэх замарозкі ў сваім раёне для многіх стане спосабам вырашэння праблемы. Тым больш што клубніцы ў ваколіцах Маларыты вырошчваюць здаўна. Наш раён самы паўднёвы ў вобласці, тут для ягады спрыяльныя ўмовы.

Гэтымі праблемамі заклапочаны і Савет па развіцці прадпрымальніцтва раёна. Нядаўна яго ўзначаліў **намеснік старшыні райвыканкама Эдуард КАНДЗЯРЭШКА.** Эдуард Пятровіч лічыць, што прыватную ініцыятыву жыхароў раёна трэба настойліва абуджаць. Асабліва гэта датычыцца маладых людзей. І для гэтага трэба найперш асветніцкая работа, якую цяпер праводзіць Цэнтр занятасці насельніцтва. Калі, скажам, сем беспрацоўных грамадзян за гэты год па накіраванні Цэнтра прайшлі навучанне па новых спецыяльнасцях, то двое маладых людзей навучаліся менавіта азам вядзення бізнесу. А такіх людзей можа стаць значна больш, трэба толькі праяўляць ініцыятыву, магчымасці ж для накіравання на праходжанне такіх курсаў ёсць. Некаторыя баяцца пачынаць уласную справу, бо не маюць нават мінімальных уяўленняў пра парадак вядзення бухгалтэрыі або складанне бізнес-плана. Падобныя курсы якраз закрываюць прабелы ў ведах.

Папярэднік Эдуарда Кандзярэшкі, цяпер яго намеснік па савеце **Ігар ШУМІЛІН, маларыцкі прадпрымальнік,** лічыць, што дзелавым людзям патрэбна нейкае аб'яднанне альбо кааперацыя. Ён і раней агітаваў калег за гэта. Але многія ставіліся да суполкі асцярожна, нібы баяліся канкурэнцыі адно аднаго. «У нас многа фермераў, — кажа Ігар Генадзевіч, — яны сапраўдныя працаўнікі, шчыруюць на зямлі ад цямна да цямна. Але ўвесь час знаходзяцца ў зоне рызыкі, не заўсёды апраўданай. Скажам, у адзін год кожны фермер пасадзіў памідоры, яны ўрадзілі, а збываць няма каму. Таму што гаспадары з суседніх раёнаў таксама вырасцілі неблагі ўраджай таматаў. Павінна быць структура, якая пралічыць патрэбы той ці іншай прадукцыі хаця б на год наперад. Патрэбна хоць невялікая кааперацыя. Бо нават калі ўдасца знайсці спажыўца, таго ж перакупшчыка з фурай, ён не паедзе да аднаго фермера, бо не загрузіцца ў яго цалкам: для фуры трэба некалькі гаспадароў, каб забяспечыць поўную загрузку машыны. Жыццё запатрабуе нешта накшталт кааперацыі або таварыства», — падсумаваў Ігар Шумілін.

На думку старшыні райсавета Алега Якубчыка, на развіццё прадпрымальніцтва ў Маларыце аказвае ўплыў блізкасць абласнога цэнтра. Такая канкурэнцыя часта не на карысць маларыцкім прадпрымальнікам. Цяжка, напрыклад, адкрываць свае прадпрыемства па вытворчасці прадукцыі, якая ўжо выпускаецца ў Брэсце. Але апошняе і надае дадатковы стымул, бо развіццё магчыма менавіта ва ўмовах канкурэнцыі. Узяць хоць таго ж Ігара Шуміліна. У яго ёсць дзве невялікія кавярні, але апошнім часам ён палічыў, што грамадскім харчаваннем не надта добра заробіш у малым гарадку, паспрабаваў заняцца продажам камп'ютараў — і мае пэўныя поспехі. Бізнес заўсёды прадугледжвае пэўную рызыку, гэта варта ўлічваць. Але сёння і ў Маларыце ёсць у каго вучыцца. Раённыя дэпутаты спадзяюцца, што Савет па развіцці прадпрымальніцтва ў новым складзе зробіць больш для актывізацыі дзелавой ініцыятывы, — адзначалася на сесіі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Маларыцкі раён.*

ЦІКАВАЯ ТЭНДЭНЦЫЯ

# Распачаць уласны бізнес

## Амаль усе новыя аб'екты бытавога абслугоўвання ў Гомельскай вобласці адкрылі сёлета індывідуальныя прадпрымальнікі

**Сетка бытавога абслугоўвання Гомельскай вобласці з пачатку гэтага года павялічылася на 78 аб'ектаў, пры гэтым абсалютная большасць — гэта аб'екты індывідуальных прадпрымальнікаў. Пра гэта паведаміў на апаратнай нарадзе ў Гомельскім аблвыканкаме начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг аблвыканкама Аляксандр КАЧАН.**

Як паведамляе БелТА, сетка бытавога абслугоўвання ў галіне налічвае амаль 3,64 тысячы аб'ектаў, з якіх больш за палову належыць юрыдычным асобам. «Пры гэтым сёлета за 11 месяцаў сетка павялічылася на 78 аб'ектаў, 99 % з якіх — аб'екты індывідуальных прадпрымальнікаў», — удакладніў Аляксандр Качан.

Начальнік галоўнага ўпраўлення адзначыў, што, па звестках на пачатак снежня, бытавыя паслугі ў рэгіёне аказвае больш за 4,3 тысячы суб'ектаў гаспадарання, з якіх 30 % — юрыдычныя асобы, 70 % — індывідуальныя прадпрымальнікі. З пачатку года колькасць такіх суб'ектаў у рэгіёне вырасла на 167: 128 — ІП, 39 — юрыдычныя асобы.

Аналіз структуры абласной сеткі бытавога абслугоўвання насельніцтва паказвае, што найбольшую ўдзельную вагу маюць аб'екты па аказанні паслуг цырульняў і салонаў прыгажосці (20,7 %), тэхнічным абслугоўванні і рамонце транспартных сродкаў (11,2 %), вытворчасці, рамонце адзення і тэкстыльных вырабаў (9,3 %), рамонце і ўстаноўцы камп'ютараў, офісных і іншых машын (амаль 8,3 %). У структуры ж відаў паслуг, якія аказваюць без аб'екта бытавога абслугоўвання, найбольшую долю — звыш траціны — маюць рамонтныя і будаўнічыя паслугі. Фізасобы часцей за ўсё (амаль 54 % у агульнай структуры) займаюцца цырульніцкай справай, касметычнымі паслугамі, манікюрам і педыкюрам.

Аляксандр Качан растлумачыў, што для забеспячэння сацстандартаў у сферы бытавога абслугоўвання ў раёнах вобласці прыняты рашэнні, якія вызначаюць формы (выязныя, стацыянарныя) для кожнага населенага пункта. «У кожным райцэнтры распрацаваны і зацверджаны графікі абслугоўвання сельскіх населеных пунктаў, вызначаны тэлефонныя нумары і час іх работы для прыёму заявак ад насельніцтва. Нарматывы дзяржаўных сацстандартаў у сферы бытавога абслугоўвання ў рэгіёне выконваюцца», — падкрэсліў ён.

Па словах дакладчыка, асноўная нагрузка па выкананні сацстандартаў на вёсцы ўскладзена на арганізацыі, якія ўваходзяць у структуру холдынга бытавога абслугоўвання «Гомельаблбыт». Так, камбінаты бытавога абслугоўвання аказваюць спектр розных паслуг у 18 раёнах вобласці, у Лельчыцкім і Жыткавіцкім — унітарныя прадпрыемствы, у Хойніцкім — ІП, фізасобы і юрыдычныя асобы.

Старшыня аблвыканкама Генадзь Салавей звярнуў увагу на тое, што пералік паслуг, у тым ліку і на вёсцы, неабходна пашыраць, больш актыўна рэкламаваць іх. «Галоўнае — улічваць патрэбы насельніцтва», — падкрэсліў кіраўнік вобласці.

**ЗВЯЗДА**

ПУНКТЫ РОСТУ

# ІДЭІ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ

## Пераможцаў конкурсу ініцыятыў па падтрымцы прадпрымальніцтва ўзнагародзілі ў Мінску

**У межах праекта «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» камісія абрала восем удзельнікаў для фінансавання. Усяго з 20 жніўня да 30 верасня 2019 года заяўкі падалі 76 праектаў. Задачы ініцыятыў-пераможцаў — падтрымка дзейнасці існуючых або новых суб'ектаў інфраструктуры прадпрымальніцтва на тэрыторыі 12 пілотных раёнаў. Агульны бюджэт праграмы — 9,5 мільёна долараў ЗША. Сродкі выдаткоўвае Еўрапейскі саюз у рамках Еўрапейскага інструмента добрасуседства, рэалізуе ідэю Праграма развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам эканомікі Беларусі.**

Пра мэты праекта расказала на цырымоніі ўзнагароджання **пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі Аляксандра САЛАЎЁВА:** «У нас важная эвалюцыя ў падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва з партнёрамі з Еўрасаюза, іншымі партнёрамі на працягу доўгіх гадоў у Беларусі. Мне здаецца, што ў гэтай эвалюцыі мы выходзім цяпер на новы этап. Мы гаворым пра развіццё не толькі бізнесаў, якія прынясуць прыбытак, развіццё рэгіёнаў, стварэнне там пунктаў росту, рабочых месцаў, але і бізнесаў, якія будуць арыентавацца на вырашэнне сацыяльных, экалагічных задач, жаночае прадпрымальніцтва, прыцягненне да работы людзей з інваліднасцю, — тобок поўнае раскрыццё патэнцыялу рэгіёнаў, прыцягненне туды моладзі, распрацоўку новых тэхналогій і ідэй».

### ОРША

Асноўная ідэя ініцыятывы з Аршаншчыны — стварэнне Цэнтра падтрымкі маладзёжнага прадпрымальніцтва на базе Аршанскага раённага цэнтра тэхнічнай творчасці дзяцей і моладзі. У праект уцягнута грамадскае аб'яднанне «Развіццё — ХХІ стагоддзе», мясцовыя органы ўлады, Парк высокіх тэхналогій, «Брэміна-Орша». На момант завяршэння праекта ў 2020 годзе будуць распрацаваны і праведзены восем курсаў па развіцці ў моладзі прадпрымальніцкага мыслення і здольнасцяў. Навучанне пройдуць каля 500 школьнікаў і вучняў ССВУ.



Беларуская IT-кампанія стварыла эксперыментальную мадэль унікальнага робата-барыста.

Фота БелТА.

### МАЛАДЗЕЧНА

Грамадскае аб'яднанне «Цэнтр маладзёжных ініцыятыў» прадставіў ідэю рэгіянальнага інавацыйнага цэнтра «Тэхнапарк ІнКата-Мол».

### КОБРЫН

Установа па развіцці прадпрымальніцтва «Школа бізнесу» плануе пашырыць сваю дзейнасць па лакальным кансультаванні. Трэнерамі стануць найбольш аўтарытэтныя члены клуба «Бізнесовыя кабрынчане», якія ўжо праявілі сябе як лідары і арганізатары. Доступ да кансультавання забяспечыць і стварэнне анлайн платформы па падтрымцы малога і сярэдняга бізнесу, а таксама спецыялізаваны дыстанцыйны курс для тых, хто жадае пачаць сваю справу.

### БЯРОЗА

У Бярозаўскім раёне Брэстчыны на тэрыторыі біязаказніка «Спораўскі» пачне працаваць Цэнтр падтрымкі аграэкапрадпрымальніцтва. Там створаць нарыхтоўчы пункт і можна будзе арэндаваць абсталяванне для перапрацоўкі сыравіны. У межах рэалізацыі ініцыятывы распрацуюць адукацыйны курс, наладзяць кансультаванне аграрыяў, адбудуцца трэнінгі.

### ЖЛОБІН

Спрыяць узмацненню патэнцыялу малых і сярэдніх бізнесаў у раёне будзе ініцыятыва «Мой горад. Мой бізнес. Мая будучыня», якая прадугледжвае правядзенне школы сацыяльнага прадпрымальніцтва, цыкл семінараў для бізнесменаў-пачаткоўцаў, курс трэнінгаў па інтэрнэт-маркетынгу і інтэнсівы па праектаванні ўласнай справы. Па плане, у 2020 годзе ідэя дапаможа адкрыць 15 новых кампаній, падрыхтаваць 10 бізнес-ідэй для сацыяльнага прадпрымальніцтва і 10 стартапаў.

### ЛІДА

Асацыяцыя «Робататэхніка і штучны інтэлект» з гэтага рэгіёна Гродзеншчыны прапанавала ініцыятыву «Мабілізатар для развіцця тэхналагічных стартапаў». Яна накіравана на стварэнне бізнес-інкубатара новага тыпу, змест якога — аказанне на камерцыйнай аснове адукацыйных паслуг у галіне лічбавых тэхналогій, суправаджэнне высокатэхналагічнага бізнесу ад ідэі да серыйнай вытворчасці.

### БАРЫСАЎ

Мясцовы фонд «Кіраванне бізнесам» выступіў з ініцыятывай «Падтрымка прадпрымальнікаў і IT-стартапаў». Яна накіравана на стварэнне ў раёне комплекснай інфраструктуры развіцця суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу і IT-стартапаў.

### БЫХАЎ

«Быхаў-інавацыйны» — праект па запуску бізнес-інкубатара, які стане пляцоўкай для навучання насельніцтва рэгіёна IT і інтэрнэт-тэхналогіям для стварэння бізнесу, стартапаў, інавацыйных кампаній. Паводле праекта, установа таксама забяспечыць падтрымку і кансультаванне пачынаючых бізнесменаў. Да канца ініцыятывы павінна быць абучана больш за 300 жыхароў Быхаўшчыны і зарэгістравана 10 бізнесаў.

**Дырэктар дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Ірына БАБАЧОНАК** адзначыла, што павышэнне ўвагі грамадзян да бізнес-дзейнасці, стварэнне ўмоў для развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва і яго трансфармацыі ў пункты росту рэгіёнаў —прыярытэты дзяржаўнай эканамічнай палітыкі. «Мы разумеем, што для дасягнення такой амбіцыйнай задачы неабходна актыўнае дзеянне як мінімум па двух кірунках. Першы — гэта стварэнне дзелавога асяроддзя і стабільных умоў развіцця прадпрымальніцтва для ўсіх прадстаўнікоў бізнес-супольнасці: буйных і малых, айчынных і замежных, інавацыйных і традыцыйных, прыватных і дзяржаўных. І другі кірунак — гэта стварэнне інфраструктуры падтрымкі, якая дазваляла б развівацца малым кампаніям і стварала б для іх пэўныя рэсурсы і падтрымку па самых крытычных момантах іх станаўлення, развіцця, прыняцця інавацыйных рашэнняў».

Конкурс — гэта толькі першы этап праекта. Далей аўтары ідэй будуць рэалізоўваць іх у жыццё, каб садзейнічаць развіццю бізнесу на сваёй малой радзіме.

**Марыя ДАДАЛКА.**


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Торговый дом «Речицкий» (арендодатель) извещает о проведении 7 февраля 2020 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование и адрес лота | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС 20 % | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | **Часть изолированного нежилого здания площадью 99,6 кв. м** (помещение, не относящееся к жилищному фонду с инв. № 350/D–263630, помещение на 1-м этаже). **Местонахождение:** г. Гомель, проспект Речицкий, д. 61. Арендная плата в месяц – **1 363,42 бел. руб.** (с учетом НДС 20 %). Коэффициент спроса – **3,0**. Базовая ставка – **0,3**. Коэффициент местоположения – **0,9**. **Цель использования:** кондитерский цех, складские помещения. **Срок аренды – 3 (три) года** | **420,81** | 42,08 |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Торговый дом «Речицкий», г. Гомель, проспект Речицкий, д. 61. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (0232) 50-32-71, Пикулина Нина Альбертовна** | | |
| **Срок подачи заявления** | **С 13.12.2019 г. по 05.02.2020 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00, по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» **(предварительно по контактным телефонам Организатора торгов)**. **Подача документов по почте не допускается** | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Расчетный счет **Продавца (ОАО «Торговый дом «Речицкий»):** р/с BY56 BLBB 3012 0400 0540 0000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, код банка BLBBBY2X, УНП 400054000, ОКПО 14458671, **назначение платежа** – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) | | |
| **Размер штрафа** | **8 (восемь) базовых величин**, согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству) | | |

**Шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и предоставить необходимые документы:** копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола оплатить Организатору аукциона по результатам аукциона вознаграждение в размере **10 (десяти) % от цены продажи Объекта** (вознаграждение оплачивается в белорусских рублях по курсу Национального банка РБ на дату подписания протокола о результатах аукциона), в том числе затраты на публикацию извещения в газете «Звязда» от 23.05.2019г. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www. expert-usluga.by в разделе «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном аукционе**

ЛОТ 7: упаковочная линия «TU-SL/3-279.6000 Plus HL/CP1» № 2, зав. № 202225/2286685/2141612, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 53 245,87 руб. (пятьдесят три тысячи двести сорок пять рублей восемьдесят семь копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 5324 руб. (пять тысяч триста двадцать четыре рубля)

ЛОТ 8: упаковочная машина «Модель SBM», зав. № Z2510950396, 2010 г. Начальная цена продажи лота – 30 030,86 руб. (тридцать тысяч тридцать рублей восемьдесят шесть копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 3 003 руб. (три тысячи три рубля)

ЛОТ 9: упаковочная линия «TU-SL/3-279.6000 Plus HL/CP1» № 3, зав. № 202226/2286700/2141613, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 69 887,08 руб. (шестьдесят девять тысяч восемьсот восемьдесят семь рублей восемь копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 6988 руб. (шесть тысяч девятьсот восемьдесят восемь рублей)

ЛОТ 10: упаковочная машина «Модель SBM», зав. № Z2510950395, 2010 г. Начальная цена продажи лота – 30 495,94 руб. (тридцать тысяч четыреста девяносто пять рублей девяносто четыре копейки) с учетом НДС. Сумма задатка – 3049 руб. (три тысячи сорок девять рублей)

ЛОТ 13: упаковочная линия «TU-SL/3-279.6000 Plus HL/CP1» № 5, зав. № 202228/2286702/2141615, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 38 086,75 руб. (тридцать восемь тысяч восемьдесят шесть рублей семьдесят пять копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 3808 руб. (три тысячи восемьсот восемь рублей)

ЛОТ 17: пакетирующий автомат 3С.154 от линии для упаковки сигарет с фильтром № 1, зав. № 2180510, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 2126,60 руб. (две тысячи сто двадцать шесть рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

ЛОТ 18: пропилено-обертывающий автомат Т-20 от линии для упаковки сигарет с фильтром № 1, зав. № 9-01000167, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 2126,60 руб. (две тысячи сто двадцать шесть рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

ЛОТ 19: пакетирующий автомат 3С.154 от линии для упаковки сигарет с фильтром № 2, зав. № 2180511, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 2126,60 руб. (две тысячи сто двадцать шесть рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

ЛОТ 20: пропилено-обертывающий автомат Т-20 от линии для упаковки сигарет с фильтром № 2, зав. № 9-98001017, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 2126,60 руб. (две тысячи сто двадцать шесть рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

ЛОТ 21: пакетирующий автомат 3С.154 от линии для упаковки сигарет с фильтром № 3, зав. № 2180512, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 2126,60 руб. (две тысячи сто двадцать шесть рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

ЛОТ 22: пропилено-обертывающий автомат Т-20 от линии для упаковки сигарет с фильтром № 3, зав. № 9-01000168, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 2126,60 руб. (две тысячи сто двадцать шесть рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

ЛОТ 23: пакетирующий автомат 3С.154 от линии для упаковки сигарет с фильтром № 4, зав. № 2180513, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 2126,60 руб. (две тысячи сто двадцать шесть рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

ЛОТ 24: пропилено-обертывающий автомат Т-20 от линии для упаковки сигарет с фильтром № 4, зав. № 9-01000169, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 2126,60 руб. (две тысячи сто двадцать шесть рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

ЛОТ 25: пакетирующий автомат 3С.154 от линии для упаковки сигарет с фильтром № 5, зав. № 2180514, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 2126,60 руб. (две тысячи сто двадцать шесть рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

ЛОТ 26: пропилено-обертывающий автомат Т-20 от линии для упаковки сигарет с фильтром № 5, зав. № 9-01000170, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 2126,60 руб. (две тысячи сто двадцать шесть рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

ЛОТ 27: пакетирующий автомат 3С.154 от линии для упаковки сигарет с фильтром № 6, зав. № 2180515, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 2126,60 руб. (две тысячи сто двадцать шесть рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

ЛОТ 28: пропилено-обертывающий автомат Т-20 от линии для упаковки сигарет с фильтром № 6 зав. № 9-01000171, 2002 г. Начальная цена продажи лота – 2126,60 руб. (две тысячи сто двадцать шесть рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

ЛОТ 29: запасные части к оборудованию. Начальная цена продажи лота – 447 042,72 руб. (четыреста сорок семь тысяч сорок два рубля семьдесят две копейки) с учетом НДС. Сумма задатка – 44 704,27 руб. (сорок четыре тысячи семьсот четыре рубля двадцать семь копеек)

**Продавец** – открытое акционерное общество «Гродненская табачная фабрика «Неман», 230771, г. Гродно, ул. Орджоникидзе, 18, Тел. 79-15-00, факс 79-15-54

**Организатор торгов** – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия проведения аукциона: победитель аукциона обязан оплатить оборудование в форме 100 % предварительной оплаты в течение 15 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи; вывоз оборудования со клада Продавца осуществляется за счет покупателя, погрузка осуществляется силами Продавца; оборудование поставляется без упаковки в частично разобранном виде; возможна оплата предмета аукциона в иностранной валюте по официальному курсу соответствующей валюты к белорусскому рублю, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день подписания протокола о результатах аукциона.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 15 января 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.**
**Последний день приема заявлений – 13 января 2020 г. до 15.00**

*Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*


ІНІЦЫЯТЫВА

# ТАНОМЕТРЫ — СТАРЭЙШЫНАМ,

## або Навошта ліфт для будынка школы ў тры паверхі?

**Нават у буйных гарадах, не кажучы пра глыбінку, у мясцовай улады паўстае пытанне: дзе знайсці для бюджэту дадатковыя грошы? А яны неабходны, каб стварыць, напрыклад, месца сямейнага адпачынку, абсталяваць прышкольную спартыўную пляцоўку, зрабіць больш цікавым наведванне музея... Гэта нескладана. Толькі трэба ведаць, дзе шукаць. Ужо існуе шмат прыкладаў карыснага супрацоўніцтва.**



Веладарожка ў Полацку.

У Віцебскім аблвыканкаме не так даўно абмяркавалі вынікі і перспектывы супрацоўніцтва органаў мясцовай улады з Еўрапейскім саюзам.

Дарэчы, Віцебск стаў трэцім горадам, у якім на працягу года прайшлі рэгіянальныя інфармацыйныя сустрэчы па ініцыятыве Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза. У сакавіку падобнае мерапрыемства адбылося ў Брэсце, у кастрычніку вынікі двухбаковага супрацоўніцтва былі падведзеныя ў Гродне.

Адкрываючы сустрэчу, кіраўнік Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Дзірк Шубель адзначыў, што ёсць розныя магчымасці для развіцця супрацоўніцтва і мерапрыемства закладзе фундамент для новых партнёрскіх адносін. Ёсць неабходнасць у адкрытым абмене думкамі з прадстаўнікамі ўлады, бізнесу і грамадскімі арганізацыямі Прыдзвінскага краю.

**Першы намеснік старшыні абласнога выканаўчага камітэта Алег МАЦКЕВІЧ** нагадаў, што Віцебшчына — адзіная ў Беларусі вобласць, якая мяжуе як з ЕС (Латвія і Літва), так і з Расіяй. Таму ёсць дадатковая магчымасць супрацоўніцтва з захадам — у якасці трансгранічнага «моста». Ён падзякаваў замежным партнёрам, якія асабіста наведваюць глыбінку і не толькі цікавяцца рэалізацыяй праектаў, але і шчыра заклікаюць працягнуць увасабленнем самых актуальных ідэй.

Сярод іншага, напрыклад, ужо запланавана фінансаванне цэнтра маладзёжнага прадпрымальніцтва ў Оршы. Грант вельмі паспрыяе развіццю дзелавой ініцыятывы ва ўсім раёне. І вельмі карысны будзе вопыт перадавых краін ЕС пры рэалізацыі канцэпцыі ў гэтым райцэнтры «Разумны горад».

З агляднай прэзентацыяй выступіў кіраўнік праграм супрацоўніцтва Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Берэнд дэ Гроат, а таксама кіраўнікі ключавых сфер праектнай дзейнасці Прадстаўніцтва.

Удзельнікамі сустрэчы былі прадстаўлены розныя праекты. У прыватнасці, рэалізаваныя пры ўдзеле Полацкага райвыканкама — па развіцці турызму і стварэнні сучаснай сістэмы асвятлення вуліц. Да таго ж менавіта палачане сталі першапраходцамі на Віцебшчыне па стварэнні паласы для веласіпедыстаў на аўтамабільнай дарозе.

У суседнім Наваполацку паспяхова рэалізуецца канцэпцыя, мэта якой — перайсці ад стварэння ўмоў у інклюзіўнай школе да інклюзіўнага горада ў цэлым. Што цікава, для зручнасці малых з абмежаванымі магчымасцямі ў адной з вучэбных устаноў нават усталявалі ліфт.

А ў Сенненскім раёне прыблізна дваццаці фельчарам купілі электрычныя ровары. І ў выніку яны сталі хутчэй дабірацца да хворых, якія жывуць нават у самых далёкіх вёсках. А «хуткую» між тым разгрузілі, бо цяпер няма нагоды выязджаць па параўнальна дробных праблемах.

У Талачынскім раёне пайшлі іншым шляхам, каб эканоміць сродкі на медыцынскія патрэбы. Там старэйшынам падарылі танометры. І цяпер мясцовыя жыхары таксама сталі меней тэлефанаваць на нумар 103, бо гіпертонікі, калі ціск павысіўся, але стан здароўя не крытычны, самастойна прымуць лекі.

Супрацоўніцтва з экспертамі ЕС дапамагае і дзяржаўным вытворцам. У прыватнасці, заходнія кансультанты падказалі прадпрыемству ў Верхнядзвінску, што зрабіць, каб атрымаць адпаведны сертыфікат на пастаўку сыроў і іншай прадукцыі ў Еўропу.

Вельмі цікавая ініцыятыва «Пагадненне мэраў па клімаце і энергіі». Яна дае магчымасць мясцовай уладзе ў глыбінцы атрымаць кансультацыі і фінансаванне ад еўрапейскіх экспертаў і банкаў. Браслаў, між іншым, у рамках рэалізацыі ініцыятывы ўжо налета стане першым у краіне так званым кліматычна нейтральным горадам. Гэта значыць, што населены пункт не будзе наносіць клімату нават мінімальнай страты. Удзельнікамі еўрапейскай ініцыятывы па клімаце і энергіі таксама сталі яшчэ дзесяць населеных пунктаў: Верхнядзвінск, Віцебск, Гарадок, Глыбокае, Докшыцы, Наваполацк, Орша, Полацк, Талачын, Шаркаўшчына.

Удзельнікамі мерапрыемства ў Віцебску сталі прадстаўнікі мясцовых органаў улады, прадпрыемстваў рознай формы ўласнасці, дзяржаўных арганізацый, грамадзянскай супольнасці з чатырнаццаці раёнаў Віцебскай вобласці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 16.01.2020 открытого аукциона**

**Лот № 1: капитальное строение с инв. № 701/С-4687 – здание автокассы**, площадь – 25,7 кв. м, назначение: здание автокассы, расположенное по адресу: Могилевская обл., Белыничский р-н, Головчинский с/с, аг. Головчин, на земельном участке с кадастровым номером 720481002601000144 (площадь – 0,0100 га, право постоянного пользования).
**Начальная цена продажи: 3 000,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 300,00 бел. руб.**

**Аукцион состоится 16 января 2020 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 15.01.2020 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

**Продавец:** ОАО «Могилевоблавтотранс», УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Порядок проведения аукциона**: для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.
**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by, на сайте ino.by**



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

Адказны за выпуск: **АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А., ЦУПРЫК Л. А., ПАПКО В. М., БЕЛЯКОЎ А. Э., ПАНАСЮК В. В., ДРЫЛЁНАК Т. Л., СУШЧАНКА М. Л.**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 12 снежня 2019 года.**